ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

Літаратура і Мастацтва

Год выдання 33-і
№ 85 (1930)
23 кастрычніка 1964
ПЯТНІЦА
Цана 4 кап.

ОРГАН МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ І ПРАЎЛЕННЯ САЮЗА ПІСЬМЕННІКАЎ БССР

ДЗЕЯЧЫ ЛІТАРАТУРЫ І МАСТАЦТВА! ЗМАГАЙЦЕСЯ ЗА ПАРТЫЙНАСЦЬ І НАРОДНАСЦЬ, ВЫСОКУЮ ІДЭЙНАСЦЬ І МАСТАЦКАЕ МАЙСТЭРСТВА ТВОРАЎ! ЯРЧЭЙ АДЛЮСТРОЎВАЙЦЕ ВЕЛІЧ І ПРЫГАЖОСЦЬ ГЕРАІЧНЫХ СПРАЎ БУДАЎНІКОЎ КАМУНІЗМА, ПЕРАМОГУ У НАШЫМ ЖЫЦЦІ НОВЫХ, КАМУНІСТЫЧНЫХ АДНОСІН!

(З Заклікаў ЦК КПСС да 47-й гадавіны Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі).

АБАВЯЗАЦЕЛЬСТВЫ РАБОЧЫХ

Прадукцыя Добрушскай папяровай фабрыкі «Герой працы» добра вядома ў Беларусі і за яе межамі. Як сустракае калектыў прадпрыемства свята Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі?

Галоўны тэхнолаг фабрыкі М. Лабаніцкі паведаміў нашаму карэспандэнту:

— Вялікі калектыў слесараў і тэхнікаў заняты мадэрнізацыяй 6-й машыны. Гэта асноўны агрэгат, які дае 48 працэнтаў усёй паперы фабрыкі. Асартымент машыны разнастайны. Тут вокладкі для сшыткаў і кніжак, гарнітольная папера. Рабочыя ўзялі абавязацельства да свята закончыць перабасталяванне — пашырыць сушыльную частку, перарабіць камунікацыі параправоду. Калі будуць закончаны ўсе работы, магутнасць машыны ўзрасце да 11 тысяч тон паперы ў год.

ДА 47 ГАДАВІНЫ КАСТРЫЧНІКА

НОВЫЯ СПЕКТАКЛІ

З вялікім энтузіязмам працуе калектыў Гродзенскага абласнога рускага драматычнага тэатра над двума новымі спектаклямі—інсцэніроўкай па апавяданню Б. Лаўранёва «Аб простай рэчы» і драмай В. Лаўрэнцьева «Шануй бацьку свайго». Абодва гэтыя спектаклі рыхтуюцца да 47-й гадавіны Вялікага Кастрычніка.

Спектакль «Простая рэч», прысвечаны барацьбе камуністычнага падполля з белагвардзейцамі ў гады грамадзянскай вайны, ставіць галоўны рэжысёр тэатра заслужаны дзеяч мастацтва РСФСР А. Струнін. Афармленне галоўнага мастака М. Гафта. Асноўныя ролі рэпетыруюць артысты М. Кавязіна, В. Грачынскі, Я. Кімберг, Л. Сторажава, А. Цароў, В. Батурын, В. Рубан і іншыя.

Напярэдадні гадавіны Кастрычніка гледачы Гродна ўбачаць і драму «Шануй бацьку свайго». У ёй расказваецца пра жыццё нашых сучаснікаў у Сібіры, пра барацьбу савецкіх людзей з перажыткамі мінулага. Спектакль ставіць малады рэжысёр Н. Алейнічава, афармленне выпускніка Беларускага тэатральна-мастацкага інстытута Н. Апіёк. У галоўных ролях заняты артысты А. Панкрат, І. Пратапопава, М. Бабок, Н. Быкава, В. Зайцава, П. Філіпаў, Ул. Дзёмін і іншыя.

І. БАШКІН.



Фота С. АНАНКІ.

Надзённае, неадкладнае

У КОЖНЫ ДОМ, КОЖНАЙ СЯМ'І

Кожную раніцу мы з нецярплівасцю чакаем прыходу паштальёна, які прыносіць нам свежыя газеты і часопісы. Вялікі свет адкрываюць чытачу старонкі перыядычных выданняў.

У Беларусі выдаюцца газеты і часопісы для розных катэгорый чытачоў, для розных узростаў. Літаратурна-мастацкія выданні разлічаны на шырокае кола чытачоў, якія любяць літаратуру, мастацтва, уважліва сочаць за новымі творамі беларускіх пісьменнікаў, кампазітараў, мастакоў, цікавяцца работай нашых тэатраў і кінастудый, бібліятэк і клубаў, сельскіх кінафікатараў і работнікаў кніжнага гандлю, аматараў самадзейнай сцэны.

Па ўсёй краіне аб'яўлена цяпер падпіска на газеты і часопісы на 1965 год. Вызначальная рыса сёлетняй падпісной кампаніі ў тым, што кожны чалавек можа выпісаць сабе любое выданне. Ніякіх абмежаванняў у тыражах больш не існуе. Гэтая акалічнасць, вядома, аблягчае правядзенне падпіскі, але адначасова яна і значна ўскладняе работу органаў Саюздруку. Бо ім трэба не выпускаць з-пад увагі многія рэспубліканскія выданні, і ў прыватнасці літаратурна-мастацкія.

Вопыт мінулых год паказвае, што там, дзе гэтаму пытанню не аддавалі належнай увагі мясцовыя партыйныя, савецкія, камсамольскія і прафсаюзныя арганізацыі, там падпіска на рэспубліканскія літаратурна-мастацкія выданні была праведзена няўмела і неарганізавана. Гэты дакор трэба кінуць у першую чаргу нашым творчым саюзам—кампазітараў, мастакоў, кінематаграфістаў, архітэктараў, Беларускаму тэатральнаму таварыству, тэатрам.

Абыякавае стаўленне да арганізацыі падпіскі з боку аддзела культуры Пінскага райвыканкома прывяло да таго, што многія ўстановы культуры раёна ў 1964 г. не выпісвалі газету «Літаратура і мастацтва». Сярод іх Кротаўскі, Пасеніцкі, Заборауські, Дабраслаўскі сельскія клубы, Ліпніцкая, Чымельская, Церабенская, Палкаціцкая сельскія бібліятэкі.

У Пінскім раёне працуюць 22 сярэднія школы, але больш палавіны з іх не атрымліваюць «Літаратуру і мастацтва». Гэта — Чухаўская, Палтаранаўская, Целяханская, Ласіцкая, Пагост-Загародская, Парахонская, Малоткавіцкая, Лемяшэвіцкая, Ставоцкая, Хоінская і іншыя сярэднія школы. Яшчэ горш з падпіскай на газету ў васьмігадовых школах, якіх у раёне 74. Не разгорнута была падпіска на літаратурна-мастацкія выданні сярод работнікаў сельскай кінасеткі (іх у раёне налічваецца да 200 чалавек), настаўнікаў і асабліва выкладчыкаў беларускай мовы і літаратуры, работнікаў кніжнага гандлю спажывецкай кааперацыі.

Вось чаму на ўвесь Пінскі раён сёлета ідзе толькі 57 экземпляраў «Полымя», 107 экземпляраў «Беларусі», 112—«Маладосці», 107 экземпляраў газеты «Літаратура і мастацтва». Памылкі, дапушчаныя ў мінулым годзе, трэба не паўтарыць. Падпіску на 1965 год неабходна правесці так, каб кожная ўстанова культуры, кожная школьная бібліятэка абавязкова мелі на сваіх паліцах рэспубліканскія літаратурна-мастацкія выданні.

Значна больш увагі трэба аддаць індывідуальнай падпісцы. Тут у нас ёсць вялікія нескарыстаныя рэзервы. Гэта ў першую чаргу самі работнікі культуры, сельская інтэлігенцыя, удзельнікі мастацкай самадзейнасці. Ідучы насустрач падпісчыкам, дазволена афармляць падпіску ў крэдыт.

З Піншчыны паступаюць першыя весткі, якія даюць падставу меркаваць, што недахопы мінулага года выпраўляюцца. У радзе калгасаў створаны саветы садзейнічання распаўсюджванню перыядычнага друку. Члены гэтых саветаў памогуць лепш правесці індывідуальную падпіску сярод калгаснікаў і сельскай інтэлігенцыі. Рэдзькаўскае аддзяленне сувязі (начальнік М. Кот) завяршыла ўжо бюджэтную падпіску. Усе ўстановы культуры гэтага сельскага Савета на 1965 год выпісалі літаратурна-мастацкія выданні. Паспяхова разгортваецца падпіска сярод мясцовай інтэлігенцыі ў Малоткавічах і Пінкавічах.

Ёсць пэўныя зрухі ў правядзенні падпіскі ў Бабруйску. 50 выкладчыкаў працуюць у музычнай школе, з іх сорак сталі падпісчыкамі на газету «Літаратура і мастацтва». Добра прайшла падпіска і ў Бабруйскім мастацкім прафесіянальна-тэхнічным вучылішчы. Арганізатарам падпіскі тут быў дырэктар вучылішча А. Ларын. Выкладчыкі і навучэнцы вучылішча выпісалі 19 экземпляраў газеты.

На жаль, не пераадолены ў нас яшчэ ведамасныя бар'еры, якія часам перашкаджаюць правядзенню многіх патрэбных і карысных спраў. У прыватнасці, непакоіць, як будзе праведзена падпіска на рэспубліканскія літаратурна-мастацкія выданні ў прафсаюзных установах культуры, сярод работнікаў кіно і кніжнага гандлю, у бібліятэках вышэйшых і спецыяльных сярэдніх навучальных устаноў, у прафесіянальна-тэхнічных вучылішчах.

Ёсць яшчэ час для таго, каб сапраўды сур'ёзна і як мае быць правесці падпіску на газеты і часопісы на 1965 год. Уся справа цяпер за тым, каб органам Саюздруку і грамадскім распаўсюджвальнікам друку актыўна памагалі мясцовыя партыйныя арганізацыі, абласныя ўпраўленні і раённыя аддзелы культуры, каб не засталося ў новым годзе ніводнага дзеяча літаратуры і мастацтва, ніводнага работніка культуры, кіно і кніжнага гандлю, якія б не выпісвалі і не чыталі літаратурна-мастацкіх выданняў.

ХАДЫ НАШАЙ ЦВЁРДЫ ПОСТУП

Радасна! — так хочацца выказаць уражанне ад паведамлення, зробленага днямі Цэнтральным статыстычным упраўленнем пры Савеце Міністраў СССР. Прамысловасць краіны перавыканала план трэцяга квартала і дзевяці месяцаў года. Звыш плана выпушчаны мільёны тон сталі, вугалю, нафты, тысячы трактараў, станкоў, халадзільнікаў, тэлевізараў, сотні кіламетраў сталёвых труб. У параўнанні з адпаведным перыядам мінулага года прырост прамысловай прадукцыі за дзевяць месяцаў склаў больш чым сем працэнтаў.

Хлебаробаў асабліва парадуюць лічбы, што паказваюць сённяшні дзень хімічнай прамысловасці, дасягненні ў справе хімізацыі сельскай гаспадаркі. Выпушчаны звыш плана мільёны тон мінеральных угнаенняў. А гэта — дадатковыя тысячы пудоў збожжа ва ўраджаі будучага года...

Не шмат месца займаюць калонкі лічбаў ЦСУ. Стрыманыя радкі побач з імі паведамляюць пра вынікі вялікай карпатлівай працы. Сярод лічбаў няма такіх, што паказалі б, якая любоў і якая сіла вяла людзей на працоўныя подзвігі. Статыстыка гэта не падлічвае. Але пра гэта хочацца думаць. Хочацца думаць пра выключны працоўны энтузіязм савецкіх людзей — іменна ў гэтыя дні, напярэдадні свята Вялікага Кастрычніка. Гэта ж яму, Кастрычніку, прысвячалі свае подзвігі, свае звышпланавыя кілаграмы, метры, гадзіны простыя савецкія людзі...

Наша краіна — нібы казачны волат, што крочыць сямімільнымі крокамі. Радасна яшчэ і яшчэ раз пераконвацца ў гэтым. Радасна чытаць лічбы статыстыкі, поўныя глыбокага і хвалюючага сэнсу. Усё бліжэйшымі робяцца далягляды, вызначаныя Праграмай КПСС.

ЛІТАРАТУРА ДЛЯ ВЁСКІ

Мінскі абласны бібліятэчны калектар накіраваў у сельскія бібліятэкі Лагойскага раёна вялікую партыю мастацкай літаратуры. Сярод кніг творы беларускіх пісьменнікаў «Нямігі крывавыя берагі» Ул. Карпава, «Вачыма часу» М. Лужаніна, «Эцюды аб прозе» Ф. Куляшова. Накіраваны таксама творы Я. Коласа, Я. Купалы, П. Броўкі у сельскія бібліятэкі Дзяржынскага, Нясвіжскага, Чэрвеньскага і іншых раёнаў вобласці. Творы беларускіх пісьменнікаў карыстаюцца вялікім попытам на вёсцы. За кастрычнік у вобласць накіравана больш пяці тысяч экземпляраў кніг.

РЫХТУЮЦЬ КАНЦЭРТЫ

Сельскія культасветустановы Кіраўскага раёна рыхтуюцца да кастрычніцкіх урачыстасцей. У сельскіх клубах і бібліятэках ідуць рэпетыцыі ў гуртках мастацкай самадзейнасці, упрыгожваюцца памяшканні. Вялікія канцэртныя праграмы пакажуць Клічаўскі Дом культуры, Лескавіцкі сельскі клуб і раённы Дом культуры. Самадзейныя артысты выконваюць песні аб партыі і Радзіме, папулярныя нацыянальныя танцы, спектаклі па п'есах беларускіх аўтараў.

БІБЛІЯТЭКА «ЮНАЦТВА»

Будаўнікі сталіцы зрабілі юнакам і дзяўчатам Мінска цудоўны падарунак — памяшканне новай бібліятэкі, якая атрымала назву «Юнацтва». Бібліятэка заняла першы паверх новага жылога будынка на праспекце імя Леніна. Пакуль што працуе абанемент. Хутка ўступіць у строй чытальная зала.

⊙

ІВАН КІСЕЛЬ — адзін з будаўнікоў Гродзенскага хімічнага гіганта. Камсамолец добра ведае, з якой нецярплівасцю чакаюць хлебаробы прадукцыю азотнатукавага, і ў гэтыя перадкастрычніцкія дні працуе з асаблівым натхненнем. Ен выконвае штодзённыя заданні на 130—140 працэнтаў.

Самааддана працуе ў гэтыя дні ўвесь калектыў ударнай будоўлі вялікай хіміі.

ДЭВІЗ: ЯКАСЦЬ І КОЛЬКАСЦЬ

Яшчэ ў мінулым месяцы рабочыя Барысаўскай піяніннай фабрыкі пачалі ганаровую перадсвяточную вахту. Яны значна перавыканалі план выпуску піяніна маркі «Беларусь-2». Вялікая партыя музычных інструментаў адпраўлена за межы нашай рэспублікі—у Маскву, Кіеў, Смаленск.

Піяніна змяніла свой вонкавы выгляд. Інструменты сталі прыгажэйшымі, яны зараз абліцоўваюцца светлымі пародамі дрэва. Аматары музыкі аддаюць барысаўскаму піяніна перавагу перад інструментамі многіх іншых фабрык.

Якасць і колькасць!—вось дэвіз, пад якім змагаюцца ўдзельнікі перадсвяточнага спаборніцтва.

Насустрач дэкадзе народнай творчасці

ЗВЫЧАЙНАЯ РЭПЕТЫЦЫЯ

Шмат разоў бачыў я выступленні гэтага калектыву ў канцэртах, чытаў пра яго поспехі ў Маскве, Рызе і іншых гарадах краіны. Танцавальны калектыў Народнага ансамбля песні і танца Палаца культуры імя Ул. І. Леніна—ансамбль Рыбальчанкі, як з любоўю называюць яго ў Гомелі,—даўно стаў гордасцю горада. Яго гісторыя—гэта выразны прыклад штодзённай творчай работы, пошукаў, выхавання маладых танцораў. Нельга не захапляцца майстэрствам самадзейных артыстаў, талентам іх кіраўніка. Я ведаю некаторых танцораў—звычайных рабочых хлопцаў, студэнтаў, інжынераў. На сцэне я пазнаю і не пазнаю іх—знаёмыя твары, але колькі ў іх гордасці і святла!

Я даўно хацеў пабываць на рэпетыцыі ансамбля, паглядзець, як нараджаецца тая лёгкасць і прыгажосць, якая заўсёды хвалюе гледачоў. Аляксандр Рыбальчанка ў адказ на маю просьбу ўсміхнуўся:

— Калі ласка... Сакрэтаў у нас няма.

... Рэпетыцыйная зала. Адны ўваходзяць сюды, як гаспадары—я пазнаю ветэранаў, другія яшчэ няўпэўненыя І, здаецца, трошкі баяцца. Нічога дзіўнага—займацца ў такім праслаўленым калектыве—вялікі гонар і вялікая адказнасць.

Сёння — звычайная рэпетыцыя, такія бываюць тры разы на тыдзень. Дзве гадзіны напружанай працы—клас, паўтарэнне асобных элементаў танца, паўтарэнне пастаўленых ужо танцаў, развучванне новых.

Калектыў пачаў падрыхтоўку да трэцяй Дэкады народнай творчасці рэспублікі. Мне здаецца, што іншым калектывам горада, як гэта ні дзіўна, лягчэй: новы танец — гэта поспех. Для ансамбля пад кіраўніцтвам А. Рыбальчанкі даўно стала законам — новая праграма павінна быць лепшая, больш святочная, чым папярэдняя. А гэтага дамагчыся нялёгка. Прыгадайце апошнюю праграму ансамбля «З песняй — у дарогу». Ды і патрабаванні да такога калектыву, зразумела, больш строгія. Гэта добра ведаюць і танцоры, і народны артыст рэспублікі А. Рыбальчанка.

Звычайная рэпетыцыя—дробны стук абцасаў, баяністы Віктар Філонаў і Цімафей Бяроза выводзяць вясёлыя музычныя мелодыі; тэмп, тэмп, тэмп... Ніводнай страчанай секунды. Памочнік А. Рыбальчанкі Мікалай Ражкевіч—сам выдатны танцор—праводзіць уступную частку заняткаў. Праводзіць спакойна, упэўнена і строга, падыходзіць, паказвае, папраўляе. І зноў гучыць музыка, і зноў—тыя ж рухі, танец патрабуе дакладнасці і выразнасці. І тут у многім кіраўнікам памагаюць ветэраны калектыву, навічкам іх парады вельмі карысныя. І яшчэ адна характэрная рыса—дысцыпліна на рэпетыцыях. Я б сказаў так—творчая дысцыпліна. Кіраўнік і раіцца з удзельнікамі, і выслухоўвае іх думкі, але яго слова—рашаючае, і ўсе яму вераць, аўтарытэт А. Рыбальчанкі ў калектыве вялікі. Аўтарытэт, заслужаны працаю і талентам.

У гэты вечар А. Рыбальчанка праводзіў заняткі з жаночай групай, М. Ражкевіч—з мужчынскай. Калектыў рыхтаваўся да выступлення на вечары германа-савецкай дружбы —паўтараў «Украінскі танец» з мінулай праграмы. Танец гатовы, карыстаецца нязменным поспехам у гледачоў. А. Рыбальчанка зноў скрупулёзна паўтарае і правярае кожную дэталь—ад касцюмаў да музыкі. Здавалася б—для ўдзельнікаў гэта і пройдзены этап, ды і надакучыць магло паўтарэнне аднаго і таго ж. Але не—запал, тэмп, жыццярадаснасць зноў і зноў відаць у кожным руху. І, мне здаецца, у гэтых на першы погляд аднастайных паўтарэннях самадзейныя артысты правільна бачаць шлях да майстэрства, без якога немагчыма пастаноўка новых танцаў. Самае галоўнае ўражанне, што засталося ў мяне пасля гэтай рэпетыцыі, — гэта вялікая праца і натхненне ўдзельнікаў ансамбля.

Хутчэй з-за сціпласці, чым з-за нежадання выдаць, нейкія свае творчыя «сакрэты», А. Рыбальчанка пакуль неахвотна гаворыць пра будучую праграму. Нядаўна ён ездзіў у Мінск, падбіраў рэпертуар. Гаруе—мала пішуць беларускія кампазітары добрых песень. Дзе, напрыклад, узяць сёння песню пра Беларусь, якою можна было б адкрыць праграму? «Радзіма мая дарагая» Ул. Алоўнікава? Песня сапраўды добрая, але яна ўжо гучала ў выкананні ансамбля, а паўтарацца не хочацца. Кампазітарам рэспублікі, думаецца, трэба прыслухацца да гэтай заўвагі. Аб рэпертуары, нават калі хочаце — рэпертуарным «голадзе» ў дні падрыхтоўкі да Дэкады, гавораць усе — атрымаўся нейкі даволі вялікі разрыў паміж патрабаваннямі і магчымасцямі самадзейных (я ўжо не кажу аб прафесіянальных) калектываў і «прадукцыяй», якую даюць беларускія кампазітары.

А новая праграма, якая задумана А. Рыбальчанкам, прысвечана Беларусі. Гэта будзе, відаць, вакальна-харэаграфічны спектакль—аб працы і доблесці беларускага народа, аб сонцы і кветках нашай рэспублікі.

Цяпер, пасля летняга адпачынку, танцавальная група аднаўляе сваю «форму». Гэта—пачатковая, планавая фаза падрыхтоўкі да Дэкады—без яе немагчымы рух наперад. У калектыў прыйшло многа навічкоў—студэнтаў, рабочых, школьнікаў. Трэба вызначыць іх здольнасці, каб правільна расставіць сілы. Пакуль яны сядзяць на «лаве запасных», але ў новых танцах і яны, вядома, зоймуць сваё месца. Міне час, і навічкі стануць такімі ж, як Валерый Турык і Маргарыта Міхайлава, Генадзь Кабашнікаў і Віктар Каржыцкі, ветэраны і гордасць ансамбля.

А рэпетыцыя ідзе сваім ладам. На тварах людзей не адчуваецца стомленасці. Здаецца, што заняткі толькі пачаліся—вялікае жаданне танцаваць у хлопцаў і дзяўчат

Д. РАДЗІНСКІ.



На здымках фотакарэспандэнта БЕЛТА Ч. Мезіна: Надзя Маркава, школьніца, самая маладая танцорка ансамбля.

Рэпетыцыя закончана, але ніхто не разыходзіцца. Ідзе ажыўленая гаворка ўдзельнікаў ансамбля з народным артыстам рэспублікі Аляксандрам Рыбальчанкам.

НАРАДЖЭННЕ КАЛЕКТЫВАЎ

Калектывы мастацкай самадзейнасці нашага горада актыўна рыхтуюцца да Дэкады народнай творчасці. На прадпрыемствах, у арганізацыях і навучальных установах створаны агляднія камісіі, вылучаюцца сродкі, каб набыць касцюмы, музычныя інструменты, тэатральны рэквізіт.

Добры падарунак да агляду рыхтуюць будаўнікі. Здаецца ў эксплуатацыю новы Дом культуры чыгуначнікаў.

За апошні час створана некалькі новых калектываў мастацкай самадзейнасці. Гэта — хор работнікаў міліцыі, танцавальны калектыў і ансамбль баяністаў фабрыкі музычных інструментаў, эстрадны аркестр палітэхнікума, выяўлены здольныя чытальнікі, вакалісты, музыканты.

Дырэкцыя Маладзечанскага музычнага вучылішча вылучыла вялікую групу студэнтаў старэйшых курсаў, якія пад наглядам сваіх выкладчыкаў на грамадскіх асновах кіруюць харавымі калектывамі. Такая творчая дапамога аказваецца цяпер самадзейным гурткам 16 прадпрыемстваў і арганізацый горада. Хутка будзе праведзен конкурс на лепшы духавы аркестр горада.

Ажывілася творчае жыццё ў народным тэатры мэблевай фабрыкі. Нядаўна адбылася прэм'ера спектакля паводле апавядання М. Вірты «Фірма Клеменс і сын». Артысты працуюць цяпер над новым спектаклем. Народны тэатр гарадскога Дома культуры рыхтуе два спектаклі: «Цемрашалы» А. Талстога і «Танежскія дзяўчаты» С. Гурыч. Пры тэатры створан дзіцячы драматычны калектыў «Спадарожнік». Ён таксама рыхтуецца да агляду.

Новыя песні і танцы развучвае народны ансамбль песні і танца гарадскога Дома культуры. Нядаўна гэты калектыў выязджаў на гастролі ў Калінінградскую вобласць. Канцэрты ансамбля цёпла прымалі гледачы.

У дапамогу кіраўнікам мастацкай самадзейнасці ў бібліятэцы імя Н. К. Крупскай арганізавана вялікая кніжная вітрына, на якой сабраны метадычныя распрацоўкі, зборнікі песень, танцаў, вершаў, асобныя музычныя творы. У горадзе праведзен семінар кіраўнікоў харавых калектываў.

Я. ХАЦІЛОЎСКІ,
загадчык Маладзечанскага гарадскога аддзела культуры.

ГАВОРКА АБ ДЗІЦЯЧАЙ КНІЗЕ

Днямі адбыўся сход секцыі дзіцячай літаратуры Саюза пісьменнікаў БССР сумесна з беларускім Таварыствам дружбы і культурных сувязей з замежнымі краінамі. Пісьменнікі П. Кавалёў, Я. Семяжон, А. Пальчэўскі, В. Вітка расказалі аб рабоце Міжнароднай канферэнцыі па дзіцячай літаратуры ў Празе, удзельнікамі якой яны з'яўляліся. Выступаючыя гаварылі таксама аб паляпшэнні выдання дзіцячых кніг у рэспубліцы, аб пашырэнні творчых сувязей з пісьменнікамі братніх краін.

На сходзе выступіла таксама намеснік старшыні Таварыства В. Чарняўская. Яна прысвяціла сваё выступленне прапагандзе беларускай дзіцячай літаратуры за межамі рэспублікі.

ВЕЧАР У ПАЛАЦЫ КУЛЬТУРЫ

У Мінскім Палацы культуры прафсаюзаў 20 кастрычніка адбыўся ўрачыстасцей вечар, прысвечаны 150-годдзю з дня нараджэння М. Ю. Лермантава. Вялікую залу запоўнілі рабочыя, служачыя, пісьменнікі, артысты.

Вечар адкрыў паэт А. Вялюгін. Даклад аб творчасці выдатнага сына Расіі зрабіў С. Грахоўскі. Затым з чытаннем перакладаў вершаў М. Ю. Лермантава і сваімі творамі выступілі П. Пестрак, А. Зарыцкі, М. Аўрамчык. Удзельнікі калектываў мастацкай самадзейнасці Палаца чыталі вершы паэта, выконвалі рамансы і песні, напісаныя на творы М. Ю. Лермантава.

АРТЫСТЫ САЎГАСНАГА КЛУБА

Клуб саўгаса «Бярозкі» знаходзіцца ў добрым, прыгожым мураваным будынку. Шмат увагі аддае свайму асяродку культуры дырэкцыя саўгаса і рабачком. Кожны год адпускаюцца сродкі на яго рамонт і на іншыя патрэбы. І сёлета клуб падрыхтаваны ўжо да зімы. Пафарбавана падлога, дзверы, вокны, зроблена пабелка. У клубе паравое ацяпленне, і сёлета яно будзе працаваць на газавым паліве.

У клубе кожны вечар адбываецца то канцэрт мастацкай самадзейнасці, то вечар адпачынку, лекцыі, канферэнцыі чытачоў, дэманструюцца фільмы.

Добра зарэкамендаваў сябе танцавальны гурток, якім кіруе работніца саўгаса студэнтка-завочніца Любоў Цішчанка. Гурток ахвотна наведваюць маладыя рабочыя саўгаса — Вера Патапава, Святлана Гаўрылава, Марыя Галава, Галіна Бандарэнка і іншыя.

Эстрадным аркестрам кіруе загадчык клуба Васіль Яраш. Аркестр пачаў працаваць не так даўно, але ўжо заваяваў папулярнасць сярод моладзі. З цікавымі праграмамі выступае агітбрыгада.

Цяпер галоўнае ў рабоце клуба — падрыхтоўка да раённага агляду мастацкай самадзейнасці. Хор развучвае многа песень, сярод іх «Ракета» Тулікава, «Марш брыгад камуністычнай працы», «Малады аграном» і іншыя. Танцавальны калектыў падрыхтаваў «Малдаўскі танец», ідуць рэпетыцыі «Рускага пераплясу» і «Волжскай кадрылі». Выступіць таксама мужчынскі вакальны квартэт у суправаджэнні эстраднага аркестра. Рыхтуюцца да выступленняў удзельнікі акрабатычнага гуртка. Шмат новых нумароў развучваюць салісты і чытальнікі.

Я. АГАПІТАЎ.
Гомельскі раён.

ПРАБЛЕМЫ ДАКУМЕНТАЛЬНАГА КІНО

І НАВУКОВА, І ПАПУЛЯРНА

Е. БОНДАРАВА,
дацэнт кафедры журналістыкі БДУ імя Ул. І. Леніна

НАВУКОВА - ПАПУЛЯРНАЕ кіно — важная галіна савецкай кінематаграфіі. Развіццю яго ўдзяляецца ўсё больш увагі, сфера прымянення яго бясконца пашыраецца. З дапамогай навукова-папулярнага кіно мы пранікаем у таямніцы прыроды, забіраемся ў марскія глыбіні і лясныя гушчары, адкрываем новыя землі, сочым за палётам спадарожнікаў і караблёў у космасе... Мікрасвет і Сусвет, бачныя і нябачныя працэсы жыцця — ва ўсё гэта пранікае ўзброены кінакамерай і адпаведнымі ведамі чалавек.

Аднак пры стварэнні твораў навукова-папулярнага кіно, пры тэарэтычным асэнсаванні яго з'яў было і ёсць нямала цяжкасцей. Пераадольваць іх дапамагае станоўчы вопыт многіх майстроў кінематаграфіі.

Першым, найбольш значным савецкім навукова-папулярным фільмам была, як вядома, створаная Усеваладам Пудоўкіным карціна «Механіка галаўнога мозгу» (1925 г.). Чым вызначаўся гэты фільм? Складаныя пытанні матэрыялістычнага вучэння акадэміка І. П. Паўлава аб псіхафізічнай дзейнасці чалавека раскрыта ў стужцы з абсалютнай навуковай дакладнасцю. І апавядаецца пра гэта проста і разам з тым вобразна. Тут няма мудрагелістых кінематаграфічных прыёмаў. Аўтары расказваюць пра навуковы эксперымент проста і цікава. Яны даюць нам магчымасць пранікнуць у сэнс навуковай праблемы, бачыць шляхі яе вырашэння, адчуць практычнае значэнне адкрыцця. Так былі арганічна з'яднаны дзве асноўныя асаблівасці навукова-папулярнага фільма—змястоўнасць, навуковая каштоўнасць матэрыялу і яго даступнасць для шырокага гледача — інакш кажучы, навуковасць і папулярнасць.

Гэтыя ж якасці абумовілі поспех многіх лепшых савецкіх навукова-папулярных фільмаў, выпушчаных у даваенны і пасляваенны час. Гэта не значыць, што ўсе яны зроблены па першапачатковаму ўзору, паўтараюць яго метад і стылістыку. Кожны аўтар шукаў новыя шляхі навуковай папулярызацыі. Але ва ўсіх у цэнтры ўвагі было галоўнае для навукова-папулярнага фільма — важнасць і надзённасць узнятага пытання, яго навуковае і практычнае значэнне. Менавіта гэтыя патрабаванні ў той ці іншай форме прад'яўляла да навукова-папулярнага фільма і большасць удзельнікаў дыскусіі, якая нядаўна вялася на старонках часопіса «Искусство кино».

І вось, калі з такімі канкрэтнымі і даволі сур'ёзнымі патрабаваннямі падыходзіць да прадукцыі нашай Мінскай студыі навукова-папулярных і хранікальна-дакументальных фільмаў, то трэба кінуць у яе адрас нямала папрокаў і заўваг. Перш-наперш пра тое, што амаль палавіна стужак, аднесеных да навукова-папулярнага кіно, нічога агульнага з ім не маюць. У іх няма асновы асноў — навуковасці, праблематычнасці.

Ну, якое дачыненне да навукова-папулярнага фільма мае, скажам, стужка «Пятрусь Броўка»? Хіба тут ідзе навуковае даследаванне асаблівасцей творчасці паэта, раскрываецца яго метад, стыль, светапогляд? На экране ўзноўлена некалькі момантаў з жыцця паэта і пісьменніцкай арганізацыі рэспублікі, дадзена агульная ацэнка творчасці паэта. Гэта дакументальны фільм. Сярод мінулагодняй навукова-папулярнай прадукцыі знаходзім чамусьці «На блакітных плёсах» — відавы фільм аб прыгажосці возера Нарач. Ён пабудаваны на пейзажах, на жывапісных відах і нічога навуковага ў сабе не мае. Гэта таксама хутчэй дакументальная стужка. Трапілі ў разрад навукова-папулярных і публіцыстычныя кінанарысы — «Кастусь Каліноўскі», «У шаленстве экстазу» і іншыя. Я нічога дрэннага не хачу сказаць пра ўсе гэтыя фільмы. У кожным з іх ёсць свае вартасці. Але чаму яны лічацца навукова-папулярнымі?

Бадай, таму, што патрабуе план. Студыі трэба выпусціць пэўную колькасць навукова-папулярных фільмаў: яна ж носіць назву «Студыя навукова-папулярных і хранікальна-дакументальных фільмаў». Мае значэнне і аплата за стварэнне навукова-папулярнага фільма, крыху большая, чым за хранікальна-дакументальны. Таму рэжысёры зацікаўлены, каб іх фільмы называліся навукова-папулярнымі. Асабліва гэта датычыць так званых «заказных» фільмаў. Тут нярэдка не ўлічваецца ні від, ні жанр. Адзіны крытэрый мастацкай якасці — патрабаванне заказчыка. Так з'яўляюцца фільмы-гібрыды, дзе няма дастаткова акрэсленых жанравых асаблівасцей.

Спрэчнай з'яўляецца практыка стварэння так званых «фільмаў-плакатаў», «фільмаў-інструкцый». Яны звычайна будуюцца на ўмоўным сюжэце, падзеі інсцэніруюцца, падганяюцца пад загадзя прыдуманую аўтарамі (у адпаведнасці з патрабаваннямі заказчыка) схему. Па такой схеме зняты, напрыклад, фільмы «Лясны дазор» (аўтар сцэнарыя Г. Шыловіч, рэжысёр В. Дашук, аператар М. Бераў), «Хачу быць здаровым» (аўтар-рэжысёр-аператар В. Шаталаў), «Паўлік» (сцэнарый І. Грамовіча, рэжысёр Ул. Стральцоў, аператар С. Фрыд) і інш.

«Лясны дазор» зроблены па заказу Міністэрства асветы і ілюструе дапамогу піянераў дарослым у ахове лесу. Другі фільм расказвае пра ўмовы, пры якіх можна вырасціць дужых, фізічна развітых дзяцей, трэці — пра выхаванне ў падлеткаў правільных адносін да рэчаў. Усё тут як быццам правільна і пераканальна. І разам з тым на першы план выступае ўмоўнасць, зададзенасць. Адчуваеш, што ўсё разыгрываецца спецыяльна для здымак, а не бярэцца з жыцця, не даказваецца на фактычна-даставерным матэрыяле. Зразумела, па-сапраўднаму рабіць такія фільмы было б значна цяжэй, тут спатрэбілася б вялікая папярэдняя работа — даследчая і арганізатарская. А гэта некаторым аўтарам сцэнарыяў і работнікам студыі, як кажуць, не па душы.

Перад стваральнікамі фільма «Палявод-механізатар» — сцэнарыстам Г. Бекарэвічам, рэжысёрам Л. Матусевічам, аператарам Я. Сакаловым стаяла задача паказаць, як ідзе выхаванне працоўных навыкаў у старшакласнікаў сельскай школы, як вучні авалодваюць спецыяльнасцю палявода-механізатара. Гэтую ідэю аўтары паспрабавалі раскрыць на фактычным матэрыяле — на жыцці адной школы. Але потым яны нібы спалохаліся жыццёвай праўдзівасці і «зашыфравалі» герояў, а паляводам зрабілі акцёра.

Зразумела, усе гэтыя хібы з'яўляюцца таму, што цяжкасці ў авалоданні матэрыялам, у здымках часам паўстаюць вялізарныя.

Трэба сказаць, што работнікі студыі вядуць вялікую работу. Пахвальна само па сабе імкненне калектыву павялічыць колькасць фільмаў і пашырыць тэматыку, разабрацца ў складаных навукова-тэхнічных праблемах. Сярод выпушчаных за апошнія гады беларускіх навукова-папулярных фільмаў ёсць такія, што зроблены з густам, па-майстэрску. Прыгадаем хоць бы такія стужкі, як «Адзін гектар пашы», «Каларадскі жук», «Торф — наша багацце», «Чароўныя ніці» і некаторыя іншыя. У іх праўдзівая, жыццёвая аснова, навуковы падыход да праблемы, папулярная форма. Праўда, і гэтым лепшым фільмам часам нестае глыбіні, праблематычнасці. Прычыны розныя. У адным выпадку стваральнікі фільма занадта захапляюцца папулярызатарствам, у другім адчуваеш, што аўтары недастаткова авалодалі матэрыялам.

Ёсць і яшчэ адна прычына таго, чаму Мінская студыя навукова-папулярных і хранікальна-дакументальных фільмаў не часта выпускае значныя навукова-папулярныя стужкі. На студыі, мне здаецца, не заўсёды ведаюць асноўныя навукова-тэхнічныя праблемы, над якімі працуюць у рэспубліцы. І ў план трапляюць не заўсёды першачарговыя і жыццёва важныя тэмы. Няма ў рабоце кінастудыі пэўнай перспектыўнасці і мэтанакіраванасці.

Каштоўнасць і значэнне навукова-папулярнага фільма абумоўліваецца, вядома, не толькі выбарам тэмы і канкрэтнага матэрыялу. Важна таксама і знайсці адпаведную форму падачы. Ёсць два асноўныя спосабы папулярызацыі дасягненняў навукі і тэхнікі. Адзін з іх можна ўмоўна назваць «дыдактычным». У гэтым выпадку праблема раскрываецца праз сістэму лагічных паняццяў, вывадаў. Звычайна да такога спосабу звяртаюцца пры стварэнні кіналекцый, вучэбных фільмаў. Але больш дзейсны — вобразны спосаб папулярызацыі, у такім выпадку закранаецца не толькі розум, але і пачуцці гледача. Гэты шлях больш складаны.

Але тут паўстае пытанне, як разумець вобразнасць у навукова-дакументальным кіно, якая яго прырода. Некаторыя аўтары бачаць «вобразнасць» толькі ў знешняй форме, у прымяненні сродкаў іграва кіно. І яны шукаюць «ігравы» сюжэт, ствараюць пэўныя «драматычныя» сітуацыі. Пры гэтым нярэдка мала ўвагі ўдзяляецца самой навуковай праблеме, форма засланяе сабой змест, найгрыш — сапраўдную займальнасць. Вядома, інсцэніроўкі, як спосаб адлюстравання рэальных фактаў ці акалічнасцей, не супрацьпаказаны навукова-папулярнаму кіно. Але ж імі трэба ўмела карыстацца. Не кожную задачу навуковай папулярызацыі можна вырашыць, прыбягаючы да штучна створаных сюжэтных сітуацый. Многія навуковыя праблемы патрабуюць абсалютнай дакладнасці, строгасці і разам з тым выразнасці выяўленчых сродкаў. Згодна такому прынцыпу і зроблены фільмы аб палёце ў космас. Нічога тут не разыграна, не інсцэніравана. Факты, дакументы, лічбы. А сіла ўздзеяння вялікая! Тут, зразумела, захапляе сам матэрыял, яго незвычайнасць. Але мае значэнне і спосаб яго падачы. Гэты спосаб іншы раз робіць цуды — зусім «сухі» матэрыял пачынае эмацыянальна ўздзейнічаць. Гэты прынцып «арганізацыі матэрыялу» аўтары ўжылі і ў фільмах «Сцяг партыі», «Рукапісы Леніна», «Ленін» («Апошнія старонкі»), што выпушчаны нядаўна «Маснавукфільмам». Усё тут дакладна, нічога не разыграна, у кадры—рукапісы, кнігі, фатаграфіі. Але ўсё гэта падначалена галоўнай аўтарскай задуме, суправаджаецца разумным і пранікнёным каментарыем. І на экране паўстае вобраз жывога Леніна — барацьбіта, мыслісля, палітыка, дзяржаўнага кіраўніка і проста чалавека. Вобразнасць, такім чынам, дасягаецца ўсім строем фільма, кінастужка набывае эстэтычныя якасці, папулярызацыя ператвараецца ў мастацтва. Гэтыя фільмы з'яўляюцца адказам на спрэчнае пытанне: мастацтва ці не мастацтва навукова-папулярнае кіно? Мастацтва тады, калі пераканаўча вырашана навукова-папулярызатарская і мастацкая задача, калі выяўленчыя сродкі ўмела скарыстаны для раскрыцця навуковай праблемы.

Мне здаецца, што тут мае значэнне і правільны выбар жанру фільма. Навукова-папулярнае кіно — від кінематографа. Яно можа быць прадстаўлена рознымі жанрамі — ад кіналекцыі да нарыса. А ад выбару жанру ў многім залежыць характар даследавання, выяўленчыя сродкі і прыёмы.

Такім чынам, майстэрства стваральніка навукова-папулярнага фільма заключаецца ў тым, каб глыбока авалодаць навуковымі ведамі, пранікнуць у таямніцы праблемы, правільна вылучыць аб'екты здымак і аб'яднаць увесь матэрыял адзінай задумай. Папулярызаваць — значыць раскрываць сутнасць і значэнне, шляхі практычнага ўвасаблення пэўнай навуковай ці тэхнічнай праблемы, перадавога вопыту. Дзеяч навукова-папулярнага кіно — не бясстрасны інфарматар, ён актыўны прапагандыст, барацьбіт за ўсё новае, прагрэсіўнае. Уменне ўзняць і вырашыць праблему, унесці ў яе публіцыстычную страснасць, арганічна з'яднаць сапраўдную навуковасць і папулярнасць — гэта патрабуецца ад сцэнарыста, рэжысёра, аператара і рэдактара навукова-папулярнага кіно. Без гэтага немагчыма вырашыць галоўную задачу — стварыць фільмы глыбокага і актуальнага зместу і выразнай формы.

Мінскі абласны Дом народнай творчасці арганізуе для аматарскіх калектываў кансультацыі з удзелам вопытных майстроў харэаграфіі і навучэнцаў рэспубліканскіх курсаў па падрыхтоўцы кіраўнікоў мастацкай самадзейнасці. Навучэнка курсаў Аня Чайко выступае перад удзельнікамі харэаграфічнай студыі Івянецкага Дома культуры.

Фота Ул. КРУКА.

Нашы інтэрв'ю

МАРШРУТ: КІЕЎ І РЫГА

Беларуская музычная культура, беларускае выканаўчае мастацтва з кожным годам усё больш выносяцца на ўсесаюзную арэну і становяцца здабыткам масавага слухача. Нашы артысты — спевакі, інструменталісты — выязджаючы з канцэртамі ў розныя гарады Савецкага Саюза, уключаюць у гастрольны рэпертуар песні, рамансы, асобныя інструментальныя творы беларускіх кампазітараў. На пытанне нашага карэспандэнта, як зараз прапагандуецца беларуская музыка за межамі рэспублікі, дырэктар Беларускай дзяржаўнай філармоніі А. Каландзёнак адказаў:

— Не так даўно калектыў Дзяржаўнага народнага аркестра БССР пад мастацкім кіраўніцтвам народнага артыста рэспублікі І. Жыновіча вярнуўся з працяглай гастрольнай паездкі па Украіне і Малдавіі. Вялікае месца ў канцэртных праграмах аркестра займалі творы кампазітараў рэспублікі і лепшыя ўзоры народнага мастацтва. А вось зусім нядаўна ад дырэкцыі Кіеўскай філармоніі да нас паступіла пісьмо з просьбай наладзіць для жыхароў украінскай сталіцы публічную лекцыю-канцэрт пра беларускую савецкую музыку, пра гісторыю яе развіцця і яе творцаў. Учора якраз такая лекцыя-канцэрт (дарэчы, яна першы раз праводзіцца за межамі Беларусі) адбылася ў памяшканні Кіеўскай філармоніі.

— Хто выступаў у якасці лектара і якая была прапанавана слухачам музычная праграма?

— Лекцыю прачытаў музыказнаўца Л. Аузрбах. У праграму канцэрта ўваходзілі Другі скрыпічны канцэрт Д. Камінскага, танец з балета «Святло і цені» Г. Вагнера, «Фантастычныя танцы» для фартэпіяна Я. Глебава, «Трыо» Л. Абеліёвіча, урыўкі з опер Я. Цікоцкага, А. Багатырова, Ю. Семянякі, песні Ул. Алоўнікава, Э. Тырманд, І. Лучанка, народныя песні. У тэматычным канцэрце прынялі ўдзел заслужаныя артысты БССР А. Астрамецкі, Е. Эфрон, Т. Пастуніна, Л. Гарэлік, выкладчык Белдзяржфілармоніі С. Мадорскі, салісты філармоніі Ул. Вепрык і Д. Зубрыч.

— Гэта я расказаў вам пра адзін маршрут нашага музычнага мастацтва за межы рэспублікі, — заўважыў А. Каландзёнак. — А вось яшчэ адзін. Праз тры дні Дзяржаўны сімфанічны аркестр Беларускай ССР на чале з галоўным дырыжорам Віталіем Катаевым выедзе на гастролі ў сталіцу братняй Латвіі—горад Рыгу. Калектыў беларускіх музыкантаў з 27 кастрычніка па 1 лістапада дасць пяць канцэртаў, у якіх таксама прыме ўдзел Дзяржаўны акадэмічны хор Латвійскай ССР.

ТЭАТР

ПАЭЗІЯ І РЫТОРЫКА

Афішы Тэатра юнага гледача паведамілі, што спектакль «Дама-невідзімка» па п'есе Кальдэрона паставіў П. Малчанаў. Каму не вядомы таленавіты артыст, стваральнік вобразаў Ул. І. Леніна, Гамлета, майстар, творчы дыяпазон якога ўмяшчае высокую трагедыю Шэкспіра і дасціпную камедыю-фарс Купалы «Прымакі»!.. Не магла не зацікавіць і яго апошняя рэжысёрская праца.

Шчыра скажам: задача, якую трэба было вырашаць пастаноўшчыку класічнай камедыі, — не лёгкая.

Драматургія Кальдэрона паэтычная. Але яна не пазбаўлена рыторыкі. Вершаванае слова тут не заўсёды змястоўнае: са шчырасцю і паэтычнасцю суседнічае часам халодна-патэтычнае, вычварнае.

У вельмі сцэнічнай камедыі «Дама-невідзімка» таксама аддадзена пэўная даніна дэкламацыйнаму пафасу, аднак ён тут не пераважае.

У спектаклі — трапнае, сакавітае «рэнесанснае» слова дамінуе над схематычным тэкстам, над яго вонкавай патэтыкай. Вершаваная форма не замінае акцёрам заўважаць рух думак і душэўныя зрухі персанажаў, разумець іх радасці і засмучэнні.

Рэжысёр разумна ачышчае п'есу ад містыкі, акцэнтуе яе рэалістычны змест — барацьбу гарачых, шчырых чалавечых пачуццяў з цемрашальскімі забабонамі. Ён з густам выкарыстоўвае традыцыі іспанскага класічнага тэатра ў пралогу і эпілогу, у вакальна-танцавальных інтэрмедыях, у дынамічным тэмпа-рытме, зграбных мізансцэнах, мастацкім і музычным афармленні. Тэатр слушна адмовіўся ад музейнага рэстаўратарства, набліжаючы гуманістычную тэму камедыі да сучаснага гледача, падкрэсліваючы канфлікт шчырага пачуцця і забабонаў, чыстага сэрца і крывадушнасці.

Сапраўдная садружнасць рэжысёра, кампазітара Я. Глебава і мастака І. Пешкура ў сцэнічным прачытанні твора надала стылявое адзінства прэм'еры. У музыцы, як і ў дэкарацыях, пануюць светлая танальнасць, задушэўная меладычнасць, выяўлены іспанская рамантыка і народнасць.

Найбольш свабодна адчувае сябе ў ролі пакрыўджанага лёсам маладога кабальера Дона Луіса Б. Барысёнак. Гэты акцёр, прывабны ад прыроды, арганічна жыве ў вобразе, пераканальна пераўвасабляецца ў ролі. І на гэты раз здольнасці артыста выявіліся поўна. Дон Луіс — і гнеўны, і добры, і няўрымслівы, і шчодры сэрцам юнак-іспанец. Ён радуецца шчасцю блізкіх, гатовы пакутаваць за праўду і абараняе свой чалавечы гонар. Б. Барысёнак добра адчувае сябе ў традыцыйным нацыянальным касцюме кабальера XVII стагоддзя. Дакладны пластычны малюнак вобраза спалучаецца з багатым эмацыянальным светам юнака.

У вобразе выразна «чытаюцца» перажыванні Луіса — яго незадавальненне лёсам, пэўнае расчараванне з прычыны няспраўджаных надзей. Артыст праз увесь спектакль не траціць лірыка-камедыйнага «зярняці» вобраза.

Многае ўдалося Л. Барташэвіч у вобразе Анхелы — «дамы-невідзімкі». Артыстка адчувае гуманістычны план ролі, адданасць яе маладой гераіні высакароднаму пачуццю, якое азарыла жыццё жанчыны новым святлом. У вобразе гарманічна з'яднаны вонкавая і душэўная зграбнасць, музычнасць інтанацый і паўднёвы тэмперамент, востры розум, вынаходлівасць і жаноцкая мяккасць. «Звышзадача» ролі — шчасце не даецца людзям інертным, абыякавым, яго трэба дамагацца настойліва, нястомна, натхнёна. Пераканальная артыстка ў сцэнах з сяброўкамі, з дзяўчатамі Ісабель і Беатрысай. Эпізоды ж з Мануэлем пакідаюць уражанне незавершанасці. Прыкметна, што Барташэвіч не знайшла яшчэ тут належнага самаадчування, адпаведных узаемаадносін з партнёрам (Г. Ваўчок). Прычына гэтага, бадай, у не зусім дакладнай трактоўцы ролі Мануэля. Ён бачыцца нам у спектаклі хутчэй ідальга, чым кабальера, што не стасуецца з літаратурнай першакрыніцай. Замінае акцёру і скорагаворка. Ён часам, нібы «праглынаючы» тэкст, не паспявае цалкам раскрыць змест сцэны, думкі персанажа.

Дыялог Мануэля з Анхелай пазбаўлены падтэксту, які б «чытаўся» выразна. Лірызм, светлы настрой, песня сэрца Анхелы сутыкнуліся з нудным шматслоўем, вонкавай патэтыкай. Магчыма, такая выканаўчая манера — не адзнака акцёрскай індывідуальнасці, а вынік некрытычнага пераймання традыцый старадаўняга іспанскага тэатра. Калі гэта так, то стыль ігры пэўным чынам разыходзіцца з малчанаўскай рэалістычнай рэжысурай, з агульным сучасным мастацкім ладам спектакля.

Прывабная, жыццелюбівая, сонечная Ісабель у выкананні Л. Горцавай. Гэта своеасаблівы «іспанскі варыянт» Мірандаліны, якая з'явілася значна пазней у Гальдоні («Гаспадыня гасцініцы»). Яна такая ж здатная на вострае слоўца, з такой жа чароўнай усмешкай, але, згодна з п'есай, менш маштабная, драбнейшая, чым італьянская гераіня. У ролі выкарыстаны цёплыя, сакавітыя фарбы, Л. Горцава пластычная, музычная і танцуе лёгка, гарэзліва. Прыемна, што наш тэатральна-мастацкі інстытут рыхтуе кадры шматпланавых акцёраў. Можна спадзявацца, што, набываючы мастацкую сталасць, маладая артыстка стане майстрам лірыка-камедыйнага вобраза.

Э. Шаміёнка (Дон Хуан) і Ж. Друцкая (Беатрыса) пакінулі дваістае ўражанне. Дзякуючы клопатам рэжысёра, яны таксама авалодалі складаным метафарычным вершам, яго арыгінальнай рытмікай. Але недастаткова ясная тэма гэтых сцэнічных вобразаў. У Дон Хуане яшчэ не адчуваецца багатага кабальера, гаспадара сям'і, які, не дзякуючы чалавечаму таленту, а скарыстоўваючы сацыяльнае становішча, намагаецца авалодаць сэрцам Беатрысы. Хацелася б, каб і Беатрыса — галоўная фігура сюжэтнага трохкутніка (Хуан — Беатрыса — Луіс) — была ў спектаклі больш паўнакроўнай, каб мітуслівасць не пазбаўляла яе прывабнасці, уласцівай артыстцы.

Востра-камедыйная, гратэскавая роля Косме — слугі Мануэля (Ю. Пашкін) таксама патрабуе ўдасканалення: Косме, пры належным выканаўчым майстэрстве акцёра, мог бы стаць своеасаблівым Санча Панса. Літаратурны тэкст вобраза дае некаторыя падставы для такога разумення героя. У спектаклі Косме валодае мяккім гумарам, сцэнічнай рухавасцю, эмацыянальнасцю. Гумар Косме—Пашкіна трапна накіраваны супраць уяўнай таямнічасці «дамы-невідзімкі» Анхелы і надзьмутасці пана-гаспадара, падкрэсліваючы народную вынаходлівасць простага чалавека. Але прафесійная нясталасць артыста, схільнасць да камікавання змяншае вартасці вобраза.

Добра, што П. Малчанаў у апошні час перадае творчы вопыт здольнай моладзі Тэатра юнага гледача. Пажадаем яму не спыняцца на дасягнутым увасабленні класічнай іспанскай камедыі, дамагчыся поўнай ансамблевасці спектакля, яго завершанасці, каб паэзія цалкам перамагла рыторыку.

М. МОДЭЛЬ.



У МАЙСТЭРНЯХ МАСТАКОЎ

НА ПАЛОТНАХ—ПРЫНЯМОННЕ

На Гродзеншчыне добра ведаюць мастака Міхаіла Плужніка, рэпрадукцыю чыёй карціны «Зіма ў Пышках» мы прапануем увазе чытачоў.

Любімая тэма мастака — прырода Прынёманскага краю. З глыбокім веданнем яе асаблівасцей напісана, напрыклад, карціна «Баржы на Нёмане». Асветленая сонцам, велічна плыве шырокая рака. На першым плане—некалькі барж, а ўдалечыні—імклівыя кацеры. Радуе ў карціне адчуванне прасторы.

Услаўляючы прыроду, Міхаіл Плужнік заўважае і рысы новага ў нашай рэчаіснасці. Гэта асабліва выразна відаць у карціне «Зіма ў Гродна» і ў палотнах, прысвечаных гігантам вялікай хіміі—Гродзенскаму азотнатукавому.

Тонка і выразна перадаў М. Плужнік рысы прыроды Прынёманскага краю ў карцінах «Вясна на Нёмане», «Вечар у лесе», «На Белым возеры», «На ўскраіне».

На персанальнай выстаўцы мастака ў Гродна будзе экспанавана каля ста яго пейзажаў і эцюдаў.

Ул. ДЗЕМІН,
наш кар.

М. ЗАМСКІ

Стружка

Мне хочацца пачаць з эпізоду амаль дванаццацігадовай даўнасці. Пасля заканчэння універсітэта мяне накіравалі на работу ў палітаддзельскую газету (у той час у заходніх раёнах Беларусі пры машынна-трактарных станцыях былі палітаддзелы). Аб сельскай гаспадарцы я меў уяўленне прыкладна такое ж, якое было ў героя вядомага марктвэнаўскага апавядання. Дагэтуль памятаю, як сумна пазіраў рэдактар на маю першую заметку аб пастуху.

Неўзабаве пасля майго прыезду рэдактар папярэдзіў мяне, што ў другой палавіне дня адбудзецца пашыранае пасяджэнне бюро райкома партыі, і мне трэба абавязкова на ім быць.

— Гэта для цябе будзе карысна, пачнеш лепш разбірацца ў раённых справах,—пераканана сказаў ён.

Пасля абеду мы пайшлі ўдвух да будынка райкома. Стаяў па-летняму цёплы і сухі дзень, хоць красавік не пераваліў яшчэ за палавіну. Той год вясна была вельмі ранняя і дружная, і ў раёне толькі і гаварылі, што да мая трэба абавязкова адсеяцца. Але з сяўбой нешта не ладзілася. Як я зразумеў са скупых слоў рэдактара, на сённяшнім бюро і павінна пра гэта ісці гаворка. У раён яшчэ раніцаю прыехаў нехта важны з вобласці і да абеду разам з першым сакратаром райкома ён пабываў у некалькіх калгасах, дашукваўся, у чым прычына адставання.

— Відаць, горача сёння будзе на бюро, — заўважыў рэдактар.

Я паглядзеў на чыстае, бясхмарнае неба і згадзіўся, што сапраўды ў памяшканні сёння павінна быць гарачавата.

— Ды я не пра гэта!—паморшчыўся рэдактар. — Многім сёння горача будзе ад таго, што з сяўбою бавяцца.

Плошчу перад будынкам райкома заставілі фурманкамі і грузавымі аўтамашынамі. (Тады яшчэ не было легкавых «газікаў», і старшыні далёкіх калгасаў прыязджалі ў раён на грузавіках).

У вестыбюлі райкома было сіня ад тытунёвага дыму. Людзі, якіх выклікалі на бюро, паціху перагаварваліся. У большасці прысутных твары чырванелі не толькі ад загару, але і ад клопату.

Нарэшце адчыніліся дзверы ў залу пасяджэнняў і ўсе павалілі туды. За сталом прэзідыума паявіліся члены бюро на чале з першым сакратаром і прадстаўнік з вобласці. У зале стала ціха.

Першы сакратар пайшоў да трыбуны. Да гэтага я ўжо некалькі разоў бачыў яго. Гаспадар, як за вочы называлі сакратара, быў невысокі мужчына гадоў пад пяцьдзесят, з заўсёды незадаволеным выглядам твару і са звычкай амаль перад кожным словам доўга цягнуць — «э-э». Пра сакратара казалі, што за два гады яго работы ў раёне яшчэ ніхто не бачыў на яго твары ўсмешкі.

Вось і цяпер, зморшчыўшыся, як ад зубнога болю, сакратар пачаў пералічваць гаспадаркі, якія адстаюць з сяўбой. Потым, зрабіўшы паўзу, ён назваў прозвішча старшыні аднаго з калгасаў, падняў яго з месца і сказаў:

— Э-э... паглядзіце на гэтага... э-э... бракароба.

Прысутныя ў зале са спагадлівымі ўсмешкамі павярнулі галовы да старшыні. Ён стаяў недалёка ад мяне — высокі, хударлявы, апрануты ў шэры брызентавы плашч з капюшонам і ў вялізныя гумавыя боты.

Апынуўшыся ў цэнтры ўвагі, старшыня густа пачырванеў, на лбе ў яго выступілі кропелькі поту. Ён доўга шукаў у кішэні насоўку, потым, выцягнуўшы яе, з мінуту выціраў твар і шыю.

Сакратар працягваў:

— Сёння мы разам з Леанідам Ігнатавічам (паклон у бок абласнога начальніка) у яго калгасе злавілі трактарыста, які сеяў, э-э, раскідным спосабам. Наўмысна павыцягваў насеннеправоды з сашнікоў сеялкі. Такое можа зрабіць толькі вораг. А старшыні да ўсяго гэтага і клопату мала. Так ці не?

Старшыня, камечачы ў руках шапку, нешта прамармытаў у адказ.

— Дык вось я прапаную выключыць яго з партыі, зняць з работы і аддаць пад суд. Усе члены бюро тут, так што цяпер і вырашым.

Члены бюро згодна заківалі галовамі. Але ў гэты момант пачуўся густы, прыгожы барытон госця з вобласці — высокага самавітага мужчыны ў фрэнчы.

— Я думаю, Іван Дзянісавіч, — сказаў ён, звяртаючыся да сакратара, — што сённяшняе пасяджэнне будзе добрым урокам для гэтага старшыні і таму давайце на першы раз абмяжуемся вымовай, а калі такое паўторыцца,— госць нядобра ўсміхнуўся, — дык і згодзімся з вашай прапановай.

Сакратар у знак згоды некалькі разоў кіўнуў галавою.

— Э-э, можаце дзякаваць Леаніду Ігнатавічу, што для вас усё добра абышлося, — сказаў ён старшыні.

Той уздыхнуў, жаласліва ўсміхнуўся і, зноў выцягнуўшы насоўку, пачаў выціраць пот, што градам каціўся з твару. А сакратар браўся за наступнага...

Пасяджэнне закончылася гадзіны праз чатыры. На двары ўжо добра сцямнела. З поля, што пачыналася адразу за мястэчкам, дзьмуў халодны вецер. Я ішоў і думаў аб тым, што ў жыцці чалавека часам выпадак вырашае ўсё. Вось каб не было на бюро прадстаўніка з вобласці—жыццё старшыні паламалася б. Лёгка сказаць — выключыць з партыі, зняць з работы і аддаць пад суд!..

Я сказаў аб гэтым рэдактару, што крочыў побач. Ён мармытнуў і заўважыў, што ніхто гэтага старшыню не збіраўся выключаць з партыі.

— Як гэта не збіраўся? — абурыўся я. — Хіба вы не чулі, што сакратар прапанаваў?

— Мала што прапанаваў, — сказаў рэдактар. — Ён бы і сам за такую прапанову не галасаваў.

Ад здзіўлення я разявіў рот:

— Дык навошта ён робіць гэта?

— Навошта? Стружку здымае.

— Стружку?..

— Так, у нас гэта называецца здымаць стружку. Час ад часу выклікаюць таго ці іншага работніка на бюро, габлююць яго, каб не забываў на свае абавязкі, каб памятаў, што начальства заўсёды за ім сочыць.

— Але ж гэты старшыня сапраўды быў вінаваты, — запярэчыў я.

— Ні ў чым ён не быў вінаваты. Зямля ў яго калгасе цяжкая — адна гліна. Вакол лясы. У нас тут, бывае, пра снег ужо забудуцца, а яны яшчэ на санках ездзяць. Спрадвеку там на два тыдні пазней у поле выходзяць. Вось і з сяўбой. Сеяць яму яшчэ нельга, а з райкома націскаюць — давай, бо цягнеш назад раён. Старшыня і даў каманду сеяць. А па грязі хіба сеялка пойдзе? Ўмомант заб'е сашнікі. Вось трактарысты і павыцягвалі насеннеправоды. Хоць раскідным спосабам, але пападзе насенне ў глебу. А так і таго не было б...

— Хіба ж сакратар гэтага не ведае?

— Чаму не ведае... Ведае. Ён жа да райкома, кажуць, недзе дырэктарам МТС быў. Але яму зводка галоўнае. А наогул, у нашага Івана Дзянісавіча такі стыль кіраўніцтва — яму здаецца, што чалавек не будзе як след працаваць, пакуль яго не вылаеш ці не напалохаеш. У нас у раёне палавіна актыву з вымовамі ходзіць. Адну знімуць, другую павесяць. Неяк сустракаю я каля райкома дырэктара нашай МТС. Бачу, ідзе, галаву павесіўшы. «Што, — пытаюся, — Рыгор Іванавіч, засумавалі, ці гаспадар выклікаў, каб трохі стружкі зняць?». «Гэта само сабой, — кажа ён, — але я вось напісаў заяву, каб знялі вымову, што далі за вывазку ўгнаенняў. А цяпер мне нешта стукнула ў галаву, што ўжо падаваў такую заяву і вымову мне знялі. Ці можа не на гэтую я падаваў?.. Хіба запомніш іх?.. Гэтае сельскагаспадарчая кампанія, так і вымову павесяць. Вось я і думаю, калі падам зараз заяву, а потым выявіцца, што ніякай вымовы ў мяне ўжо няма, дык з'есць мяне гаспадар. Скажа, што несур'ёзна стаўлюся да рашэнняў бюро»...

— Зразумеў, што да чаго? — закончыў свой расказ рэдактар.

Ён наставіў каўнер паліто і прыбавіў хады...

З тае памятнай размовы мінула нямала часу. Іншыя ветры веюць цяпер над вясковымі абшарамі. Многае, вельмі многае змянілася тут за апошнія гады. Я маю на ўвазе не толькі эканоміку, я маю на ўвазе і адносіны паміж людзьмі.

У нашым грамадстве чалавек — самае вялікае багацце. Мы ўсе памятаем, хто гэта некалі сказаў. Мы ўсе ведаем таксама, што той, хто гэта сказаў, параўноўваў простага савецкага чалавека з шурупчыкам. Гэтае параўнанне як нельга лепш характарызавала эпоху культу асобы, калі чалавек сапраўды быў толькі шурупчыкам у вялізнай дзяржаўнай машыне.

Усё гэта ў мінулым. Сыходзяць з арэны састарэлыя разуменні. Як пісалася нядаўна ў адной газеце, наш сучаснік—гэта шчыры, добразычлівы, спагадлівы і

(Заканчэнне на 4-й стар.).





Услед за «Гамлетам», выдавецтва «Беларусь» выдае «Санеты» Шэкспіра (пераклад Ул. Дубоўкі). Вы бачыце ілюстрацыі, якія зрабіў да новага выдання мастак Б. Забораў.

Свет кніг

ДЗЕЛЯ ЖЫЦЦЯ

Першы раман Мікалая Кругавых «Гонар ярма не прымае» заваяваў прызнанне чытача. Не пазбаўлены пэўных недахопаў (апісальніцтва, выпадковасць некаторых сюжэтных сітуацый), раман гэты сведчыў аб бясспрэчнай таленавітасці маладога аўтара. І таму з цікавасцю разгортваеш новы твор М. Кругавых — аповесць «Не дзеля славы».

Цяжкую і, на першы погляд, не новую тэму выбраў аўтар. У двух словах яе можна сфармуляваць так: адзіны салдат, што застаўся жывы пасля гераічнай гібелі цэлага палка, выратоўвае ад ганьбы і здзекаў воінскую святыню — палкавы сцяг. Колькі вершаў і апавяданняў, кінасцэнарыяў і п'ес напісана аб выратаванні воінскіх рэліквій у гады вайны! І нялёгка не паўтарыць ужо сказанае да цябе.

М. Кругавых не паўтарыў, не перапеў нікога. Сам ваеннаслужачы, усё свае свядомае жыццё звязаны з Савецкай Арміяй, ён здолеў знайсці свае фарбы.

У аповесці не дужа многа падзей, амаль няма тут эпізодаў, разлічаных на тое, каб ашаламіць чытача. Хутчэй наадварот: нават пра тое, што сапраўды страшнае і гераічнае, аўтар расказвае стрымана, нешматслоўна і строга. Аднак ён прымушае чытача не толькі зрокам, але і душою ўспрымаць усё, што адбываецца з яго героямі. І паступова, непрыкметна для сябе ты становішся нібы ўдзельнікам гэтых падзей: разам з героямі спадзяешся і пакутуеш, змагаешся і перамагаеш.

Герояў у аповесці М. Кругавых нямнога, але кожны з іх — жывы, паўнакроўны вобраз. Такі лейтэнант Майбарада, які гіне ад кулі гітлераўскага канваіра дзеля таго, каб смерцю сваёй прыкрыць салдата Пятра Лаўрова, што выносіць палкавы сцяг. Ён застаецца ў страі да канца, гэты знешне непрыкметны лейтэнант.

Ну, а калі б і Лаўрову суджана было б загінуць? Хто данёс бы да сваіх палкавую святыню?

Данеслі б, выратавалі б. Любы б данёс: і Іван Іванавіч Дзянісаў — волат-барадач, гэты згустак жыццёвай мудрасці і несакрушальнай вернасці салдацкаму абавязку; і задзірысты, вясёлы Сямён Крукаў, які чыстым і радасным каханнем закаханы ў кволую, зусім не створаную для нягод вайны Машаньку; і не вельмі рашучы, маўкліва-сарамлівы Сашко Дзіеў, у якога недзе тут, паблізу, родны хутар, а трэба, абавязкова трэба ісці далей; і ўжо немалады, пакладзісты Ерафеіч — Ахрыменка, які зазірнуў на свой хутар, да сваіх дзяцей, што засталіся сіротамі пасля смерці маці, і пакінуў дзяцей на чужых людзей дзеля таго, каб разам з таварышамі прабівацца да сваіх. Нават Машанька, калі б засталася зусім адна, усё роўна данесла б сцяг. Таму што, як сказаў у пачатку аповесці Пятру Лаўрову Майбарада, калі «ногі адмовяць — на руках паўзі, рукі адмовяць — кацёся...»

Ёсць святое, галоўнае ў савецкіх людзей: абавязак. І героі аповесці М. Кругавых выконвалі і выканалі яго да канца.

М. Кругавых верны жыццёвай праўдзе, ён паказвае, што былі і палахлíўцы, шкурнікі, проста здраднікі. Былі і, на жаль, мы не заўсёды ўмелі своечасова разгадаць, разгледзець, а, значыць, і пакарань іх. Не здолелі Крукаў, Дзянісаў, Ахрыменка разгледзець шкурніка і здрадніка ў Пракопе Верацёнкіне, нядаўнім сваім аднапалчаніне. Не здолеў разгадаць яго і сарамлівы Сашко Дзіеў, якому Верацёнкін толькі трошкі прыадкрыў свой сапраўдны здрадніцкі твар. І нядолгі, скарыстаўшы стомленасць, а яшчэ больш даверлівасць спадарожнікаў, цёмнай ноччу пакідае баявы пост, ідзе дадому, каб там «адседзіцца ад вайны», або, калі прыпруць фашысты, — пайсці да іх у паслугачы.

Але і гэты ўдар не зламаў і не змог зламаць непахісную ўпартасць і сталёвую волю тых, хто ідзе да мэты. І ідуць салдаты на ўсход, да сваіх — не дзеля славы, а дзеля жыцця.

Аповесць «Не дзеля славы» — твор, напісаны рукою здольнага пісьменніка. З тым большым правам павінны мы весці размову аб недахопах кнігі. А яны ў аповесці ёсць.

Узяць хоць бы таго ж Пракопа Верацёнкіна. Ён неяк адразу і назусім знікае са старонак аповесці. А Пракоп жа не выпадковая, не эпізадычная фігура ў кнізе, ён увайшоў у яе з першых старонак, і чытач паспеў пазнаёміцца з ім гэтак жа, як з усімі яго спадарожнікамі. Але Пракоп знікае, і чытач у недаўменні: а што з ім стала далей? Няўжо так беспакарана і закончацца для яго гэтыя ўцёкі, гэты, няхай без стрэлу, але ўсё роўна ўдар у спіну аднапалчан? Мне могуць запярэчыць, што, маўляў, хай чытач сам дадумвае, што з Верацёнкіным стала далей, ад гэтага, маўляў, сюжэтная тканіна аповесці не мяняецца. Мне ж здаецца — мяняецца. «Шчаслівыя» ўцёкі Верацёнкіна ў невядомасць не зусім апраўданы ў творы.

Нельга дараваць і моўных неахайнасцей, накшталт: «Проталкиваясь сквозь стиснутые зубы, с присвистом выпутываясь из вороненой поросли растрепанных усов, помятые, но еще крепкие слова одно за другим влетали в уши Лаврова, растекались в мозгу и, связавшись в мысль, терзали сердце и душу, казалось, норовили вывернуть наизнанку». Сказана многа, нават празмерна многа, а за ўсім гэтым — пустата. І пустот гэтых у аповесці нямала.

...Сочачы за кніжнымі навінкамі, чытач спадзяецца сустрэць на адной з іх прозвішча ўжо знаёмага аўтара. Ён сёння ўбачыў яго: Мікалай Кругавых. І, я ўпэўнены, ён не без карысці для сябе пазнаёміцца з яго новай аповесцю «Не дзеля славы».

Аляксандр МІРОНАЎ.

М. Кругавых. «Не дзеля славы». Аповесць. На рускай мове Выдавецтва «Беларусь», Мінск, 1964.

ТЭМА ДАСЛЕДАВАННЯ — МУЗЫЧНЫ ТЭАТР

Грамадскасць нашай рэспублікі, шматлікія ўдзельнікі самадзейнасці і музыканты-прафесіяналы даўно чакалі кніжкі аб шляхах развіцця нацыянальнага музычна-тэатральнага мастацтва, першых беларускіх операх, балетах, музычных камедыях, аб нашых выдатных дырыжорах і спеваках. Выдавецтва «Навука і тэхніка» выдала такую кнігу пад назвай «Беларускі музычны тэатр». Аўтар — музыказнаўца Б. Смольскі. На яе старонках можна знайсці нямала цікавых звестак, фатаграфій, вытрымак з перыядычнага друку. Названы тут і рэпертуар беларускага музычнага тэатра больш чым за сто дваццаць гадоў (з 1841 па 1963 год), указальнік імёнаў і назваў, кароткая бібліяграфія.

У першым раздзеле кніжкі мы знаёмімся з першапачатковымі формамі музычнага тэатра. Тут гаворыцца пра разнастайныя абрадавыя рытуалы, карагоды, гульні; пра вясельны абрад — своеасаблівую народную оперу; народную гульню «Цярэшка». З гэтага ж раздзела чытач даведваецца аб першых лялечных спектаклях у батлейцы з яе «троістай музыкай»; аб узнікненні школьных тэатраў праваслаўных брацтваў, музычна-тэатральнай дзейнасці Сімеона Полацкага, першых беларускіх кантах і «Дзіаўрышы» Афанасія Філіповіча.

Наступны раздзел — пра беларускія прыгонныя тэатры (іх было звыш двух дзесяткаў), пра першыя оперныя спектаклі і «Народную сімфонію», якую напісаў кампазітар з Нясвіжскага прыгоннага тэатра Іяган Холянд пад уплывам польскіх і беларускіх песень, пачутых ім у ваколіцах Нясвіжа.

Б. Смольскі піша аб той ролі, якую адыграў Дунін-Марцінкевіч у развіцці нацыянальнага тэатра, аб першых беларускіх аперэтах С. Манюшкі, тэатры Ігната Буйніцкага, працы хормайстра і кампазітара Л. Рагоўскага, пра актыўны ўдзел беларускіх пісьменнікаў Я. Коласа, Я. Купалы, М. Багдановіча, Зм. Бядулі, Цёткі, К. Буйлы ў тэатральным жыцці Беларусі.

Наступныя чатыры раздзелы прысвечаны развіццю беларускага музычнага тэатра пасля Вялікага Кастрычніка. Аўтар знаёміць нас з музычным жыццём Віцебска, Мінска, Гомеля, Бабруйска, Магілёва і наогул усёй Беларусі ў першыя паслярэвалюцыйныя гады. Даволі падрабязна разглядае Б. Смольскі дзейнасць 1-га Беларускага дзяржаўнага тэатра, у склад якога, апрача драматычнай трупы, уваходзілі група вакалістаў, хор, сімфанічны аркестр, балет. Тэатр здолеў паставіць на сваёй сцэне не толькі музычна-драматычныя спектаклі «На купалле», «Машэка», «Кастусь Каліноўскі», «Каваль-ваявода», але і цалкам оперу «Русалка», «Вальпургіеву ноч» з оперы «Фаўст».

Цікава ведаць і пра той факт, што на базе тэхнікумаўскага опернага класа ў Мінску была створана ў свой час студыя оперы і балета, якая за даволі кароткі тэрмін ажыццявіла некалькі пастановак і стала ядром адкрытага ў 1933 годзе опернага тэатра.

Па колькасці змешчанага матэрыялу кнігу «Беларускі музычны тэатр» можна лічыць сур'ёзным даследаваннем; і многае ў гэтым даследаванні сведчыць аб руплівай і плённай працы яе аўтара.

Пераканаўча і досыць падрабязна асветлены Б. Смольскім дакастрычніцкі перыяд гісторыі нашага музычнага тэатра. І гэтая частка кнігі па шырыні закранутых тэм можа стаць грунтоўным матэрыялам для першага раздзела будучай вялікай працы аб гісторыі беларускай музыкі. Не менш падрабязнае ўяўленне можа скласціся ў чытача і пра музычнае жыццё Беларусі ў першыя паслякастрычніцкія гады, пра пошукі нашым музычным тэатрам свайго адметнага творчага шляху.

Кніга пазбаўлена парадна-паказнога ці «юбілейнага» характару. Гаворачы аб дасягненнях нашага тэатра, Б. Смольскі не замоўчвае і яго недахопаў. Адчуваецца, што аўтару добра вядомы і калектыў тэатра, і гісторыя яго станаўлення, і прычыны асобных уздымаў і спадаў у яго творчай «біяграфіі». Нельга, напрыклад, не пагадзіцца з Б. Смольскім, калі ён піша аб значным зніжэнні ўзроўню музычнай культуры тэатра ў 1951-52 гадах у параўнанні з папярэднімі гадамі, калі на чале яго стаялі такія выдатныя дырыжоры, як А. Брон і В. Пірадаў, і трупа за тры гады здолела паставіць дваццаць оперных і балетных спектакляў.

З прынцыповых пазіцый разглядаецца і рэпертуарная «палітыка» Тэатра оперы і балета ў розныя перыяды яго дзейнасці: няўвага да творчасці рускіх кампазітараў-класікаў у першыя пасляваенныя гады, залішняе захапленне аперэтай і «аблегчаным» балетным рэпертуарам у 1958-60 гадах і г. д.

На працягу сваёй творчай дзейнасці Дзяржаўны акадэмічны тэатр оперы і балета БССР ажыццявіў пастаноўку 10 нацыянальных опер і пяці балетаў. Усе гэтыя пастаноўкі даюць багаты матэрыял для сур'ёзнай размовы аб опернай творчасці кампазітараў рэспублікі. І добра, што найбольш поўны аналіз у кнізе атрымалі менавіта нацыянальныя музычныя спектаклі. Б. Смольскі спыняецца на кожным з іх, імкнецца паказаць становішча і адмоўнае ў музыцы, лібрэта, сцэнічнай пастаноўцы, даць ацэнку іх ідэйна-мастацкай каштоўнасці. Нельга не пагадзіцца з некаторымі крытычнымі заўвагамі ў адрас асобных беларускіх опер. Аднак міжволі кідаецца ў вочы і залішняя патрабавальчасць аўтара кнігі да першых вялікіх палотнаў беларускіх аўтараў. Вось, напрыклад, што піша Б. Смольскі аб оперы Я. Цікоцкага «Міхась Падгорны»:

«...Опера з яе песеннай драматургіяй аказалася не ў сілах поўнасцю раскрыць усю глыбіню чалавечых перажыванняў. Задума аўтара паказаць пафас барацьбы за Савецкую ўладу не знайшла тут дастаткова яскравага і пераканаўчага музычнага ўвасаблення...» (стар. 111). Пасля такой крытычнай ацэнкі не зусім пераканаўча гучаць словы пра тое, што «...пастаноўка оперы «Міхась Падгорны» была ацэнена як адна з вялікіх удач тэатра...»

Не менш крытычна ставіцца аўтар кніжкі да балета М. Крошнера «Салавей» і опер «У пушчах Палесся» А. Багатырова, «Кветка шчасця» А. Туранкова. Надзвычай многа недахопаў бачыць Б. Смольскі і ў іншых творах беларускай опернай музыкі, якія былі паставлены на сцэне тэатра пасля вайны. Гэта датычыцца «Кастуся Каліноўскага» Д. Лукаса, «Дзяўчыны з Палесся» Я. Цікоцкага, «Марынкі» Р. Пукста, «Надзежды Дуравай» А. Багатырова, «Яснага світання» А. Туранкова і «Калючай ружы» Ю. Семянякі. Пры-

[Заканчэнне на 4-й стар.]

Б. Смольскі. «Беларускі музычны тэатр». Выдавецтва «Навука і тэхніка», 1963.

АБ МАЛАДЫМ ГЕРОІ

Некалькі дзён пісьменнікі М. Скрыпка і Ул. Паўлаў выступалі перад працоўнымі Гомеля. Яны сустрэліся з навучэнцамі школы механізацыі сельскай гаспадаркі, школы бухгалтарскага ўліку, з вучнямі першай Навабеліцкай школы, з рабочымі фабрыкі «8 сакавіка».

На заключным вечары ў Палацы чыгуначнікаў імя Ул. І. Леніна, на які сабралася многа моладзі, ішла гутарка аб вобразе маладога героя ў сучаснай літаратуры. М. Скрыпка расказаў прысутным аб лепшых творах беларускіх аўтараў, аб рабоце пленума Саюза пісьменнікаў Беларусі.

У вечары прынялі ўдзел мясцовыя пісьменнікі Л. Гаўрылкін, А. Грачанікаў, члены літаратурнага аб'яднання.

ЗАЎВАГІ НА ПАЛЯХ

НЕ ВЕР ВАЧАМ СВАІМ

Што б ты сказаў, паважаны чытач, калі б, напрыклад, пад паямай Якуба Коласа «Новая зямля» сустрэў нечае другое імя? Пэўна б, не паверыў вачам сваім.

А вось маленькіх дзетак прымушаюць верыць нечаму падобнаму. Факты? Калі ласка. Возьміце чытанку для першага класа «Роднае слова», якая складзена В. Ціхарававай і Ю. Грамовіч і выдадзена ў 1964 годзе. На старонцы 95-й верш «Веснавая раніца» падпісаны імем Якуба Коласа. Пранытаў я такое — і вачам сваім не паверыў, бо верш гэты (дарэчы пад назваю «Вясенняя раніца») належыць пяру другога вядомага беларускага паэта — Міхася Чарота. Упершыню «Вясенняя раніца» была надрукавана ў дзіцячым часопісе «Зоркі» ў № 2 за 1921 год, а пасля змешчана ў двухтомніку твораў М. Чарота, які выдадзены Дзяржаўным выдавецтвам БССР у 1958 годзе.

Аднак самае дзіўнае, што памылка гэтая, як тая жаба-падарожніца, вандруе з кніжкі ў кніжку. Упершыню яна паявілася ў «Родным слове» 1951 года, складальніцай якога была М. Ясюнас. Пасля памылка перавандравала ў «Роднае слова», на тытуле якога стаялі ўжо прозвішчы М. Ясюнас і В. Ціхарававай. Зноў паўтарыўся ляпсус у «Родным слове» выданняў 1961—1964 гадоў (цяпер аўтарамі яго выступаюць В. Ціхаравава і Ю. Грамовіч). Жывучасці памылкі можна проста пазайздросціць — 14 гадоў! Міжволі робіцца боязна: ці не пераселіцца яна і ў выданне «Роднага слова», якое запланавана выдавецтвам «Народная асвета» на наступны год?

І. САЛАМЕВІЧ,
аспірант БДУ імя Ул. І. Леніна.

З БЛАКНОТА КРЫТЫКА

ДЫЯЛОГ З ТАВАРЫШАМ

Рыгор ШКРАБА

Дыскусія аб праблемах сучаснага беларускага рамана, якая адбылася на старонках газеты «Літаратура і мастацтва», яшчэ раз пасведчыла: нам трэба часцей абмяркоўваць надзённыя пытанні развіцця нашай літаратуры.

Спрачацца ёсць аб чым. Часта нават ад пісьменнікаў, а не толькі ад чытачоў, можна пачуць пытанне: чаму адзін і той жа твор розныя крытыкі ацэньваюць па-рознаму, каму верыць?

Некалі было, калі мы часам жывую ісціну, трапяткую чалавечую думку падмянялі догмай. Разважалі так: калі крытык А выказаўся першым і ён займае вышэйшую пасаду, то трэба няўхільна прытрымлівацца яго думкі. Тое, што крытык Б глыбей разабраўся ў творы, у разлік не прымалася — нязручна ж папраўляць крытыка А хоць бы з павагі да яго пасады.

А было яшчэ і так, што ў разлік прымалася не тое, як напісана рэцэнзія і хто яе напісаў, а тое, дзе яна надрукавана.

Мне вельмі падабаецца парада, якую дала адна газета групе кінаглядачоў. Яны збіраліся калектыўна паглядзець новы фільм. Але вось паявіліся дзве рэцэнзіі на гэты фільм: адна хваліла яго, робячы невялікія заўвагі, а другая сурова крытыкавала. Гледачы сталі перад пытаннем: каму верыць? Калі рэцэнзенты, якія, можна сказаць, зубы з'елі на ацэнцы твораў кінамастацтва, не прыйшлі да згоды, дык што рабіць нам, звычайным гледачам? Ім аказалі вельмі проста і вельмі мудра: верце сабе. Паглядзіце фільм і складзіце сваё меркаванне. Не важна, будзе яно супадаць з меркаваннем рэцэнзентаў ці не будзе.

Ды што тут хадзіць далёка па прыклады? Возьміце ўсім вядомыя. Хіба не было супрацьлеглых ацэнак аповесці А. Салжаніцына «Адзін дзень Івана Дзянісавіча» і фільма М. Рома «Дзевяць дзён аднаго года»? А творы гэтыя жывуць, хвалююць нас, робяць сваю карысную справу. Яны сталі фактам літаратуры і мастацтва, і з імі нельга не лічыцца, прызнаеш ты іх ці не прызнаеш.

Я хачу, каб мяне зразумелі правільна. Я не за тое, каб спрачацца дзеля спрэчкі. Але змагацца за высокаідэйную і высокамастацкую літаратуру, падтрымліваць усё таленавітае, жывое, крытыкаваць шэрасць і схематызм, падробкі пад мастацтва — найпершая задача крытыка.

Цяжка зразумець тых літаратараў, якія імкнуцца знарок скампраметаваць крытыку, абвясціць яе непрынцыповай, суб'ектыўнай, прыдзірлівай. Разважаюць яны па-свойму лагічна: навошта крытыка, калі можна без крытыкі? Навошта, каб мне калолі вочы тым, што я напісаў слабы твор?

Не адзін раз даводзіцца чуць дакоры ў адрас часопіса «Полымя»: чаму ён друкуе часам крытычныя выступленні ў адрас тых твораў, якія некалькі год таму назад змяшчаліся на яго старонках? Гэта ж непрынцыпова! Бачыце, якое разуменне прынцыповасці. Пад увагу не прымаецца ні якасць твора, ні яго ідэйны і мастацкі ўзровень. Выходзіць, паколькі ўсе, ці амаль усе, буйныя творы друкуюцца ў «Полымі», дык трэба змяшчаць у гэтым часопісе толькі пахвальныя рэцэнзіі і артыкулы.

А можна пачуць яшчэ і такія разважанні. Ну, добра, ты, дарагі таварыш Н., крытыкуеш мой твор. Я літасціва табе дарую і не крыўджуся. Але ж у цябе самога ёсць галава на плячах і вось ты ёй і падумай: маеш ты маральнае права гэта рабіць ці не маеш? Відаць, не маеш. Напішы спачатку сам раман, а потым мы паглядзім. Калі ў цябе будзе лепш, што ж, тады можаш мяне пакрытыкаваць. Паслухаеш такія разважанні і падумаеш: які нетактоўны быў Бялінскі. Як у яго хапала смеласці крытыкаваць Гогаля! Той як-ніяк напісаў «Мёртвыя душы» і яшчэ сёе-тое, а Бялінскі ўсяго толькі нейкую драму «Дзмітрый Калінін»!

Мы супраць крытыкі на знішчэнне. Мы за тое, каб пра творчасць літаратара гаварылася з павагай да яго працы. Але становіцца няёмка, калі хтоніхто пачынае разважаць: усе мы робім агульную справу, дык навошта нам сварыцца, навошта нам даваць ацэнкі творам, навошта засмучаць аўтараў, рабіць ім непрыемнасці? Давайце радавацца нашым поспехам, а яны ў нас немалыя. З гэтым, відаць, можна было б згадзіцца, але справа ў тым, што ў мастацкай творчасці нельга ісці наперад, зыходзячы з сярэднеарыфметычнага нашых поспехаў, не ацэньваючы крытычна зробленае.

Як бы мы ні дакаралі нашу крытыку за недастатковую аператыўнасць, за адсутнасць паглыбленай распрацоўкі праблем майстэрства, за няўвагу часам да мастацкай формы, нельга не бачыць яе здабыткаў. Усе раманы, вакол якіх вялася палеміка, і да дыскусіі былі ацэнены нашай крытыкай. Гутарка ішла не аб тым, каб іх пераацаніць, а каб разабрацца глыбей у нашых поспехах і няўдачах, каб паказаць здабыткі беларускага рамана і абагуліць наш калектыўны вопыт. Наіўна было б думаць, што пасля дыскусіі не будзе нічога няяснага і спрэчнага, што, маўляў, пісьменніку толькі і застаецца рабіць, што садзіцца за стол і на практыцы ажыццяўляць дадзеныя яму парады. Заслуга дыскусіі не толькі ў тым, што яна высветліла некаторыя спрэчныя пытанні, але і ў тым, што яна паставіла наспеўшыя пытанні, прымусіла пісьменнікаў, крытыкаў, чытачоў шукаць на іх адказу.

Апроч таго, трэба разумець, што ёсць праблемы філасофскага, метадалагічнага, творчага парадку, на якія нельга адказаць з ходу, доўга не думаючы. З заканчэннем дыскусіі не заканчваецца абмеркаванне праблем беларускага рамана. І не толькі рамана. Дыскусія дала штуршок для вырашэння праблем іншых жанраў нашай літаратуры.

Хіба пытанне, якое ўзняў Б. Бур'ян, — аб маштабнасці чалавечых характараў, аб глыбіні адлюстравання падзей і канфліктаў — датычаць толькі рамана? Не з усімі думкамі артыкула Б. Бур'яна «Стратэгічнае поле рамана» я згодны. Наўрад ці можна сур'ёзна абмяркоўваць сцвярджэнне Б. Бур'яна, што ў рамане нельга «мімаходзь закранаць... жыццёва вельмі важныя падзеі ў жыцці герояў», а ў аповесці можна гэта рабіць. Я не падзяляю думкі Б. Бур'яна аб тым, што няма падставы гаварыць аб цэласнай уласнай канцэпцыі І. Мележа ў рамане «Людзі на балоце». Наогул, мне здаецца, што наша крытыка пакуль не адказала на пытанне, што азначае прынцыповая ўдача І. Мележа для беларускага рамана, якія якасці, накопленыя беларускай прозай, ён асэнсаваў, развіў і рэалізаваў у сваім творы. Але асноўны пафас артыкула Б. Бур'яна мне зразумелы. Крытык за тое, каб раман быў раманам, каб у ім былі рамановыя характары, каб ён быў маштабным у часе і прасторы, у ахопе падзей і людскіх лёсаў.

Можна спрачацца і з некаторымі думкамі артыкула В. Каваленкі «Удакладнім пазіцыі». Мне здаецца, што нельга ў жаданні І. Навуменкі, каб у нашых раманах былі буйныя людскія характары, бачыць спробу паставіць літаратуру над жыццём, ці ва ўсякім выпадку недаацэнку жыццёвага факта. Праблема аб адносінах мастацтва да рэчаіснасці мае многа аспектаў. Узяць хоць бы такія: жыццёвая праўда і мастацкі вымысел, права мастака на абагульненне і адбор жыццёвага матэрыялу, прататып і мастацкі характар і многія іншыя. Які прастор для спрэчак і дыскусій, для перакрыжавання розных меркаванняў і довадаў! Але разам з тым, мне зразумелы пафас артыкула В. Каваленкі «Удакладнім пазіцыі». Ён накіраваны супраць ілюстрацыйнасці, супраць ухілення ад супярэчлівых з'яў рэчаіснасці, супраць падыходу да яе з гатовымі, хай сабе нават вельмі дасканалымі, схемамі...

Праўда, не абышлося ў дыскусіі і без выказванняў павярхоўных, без спроб здзівіць чытачоў палажэннямі, сканструяванымі без уліку ўсёй разнастайнасці літаратурных з'яў.

Выкладчык Гродзенскага педінстытута Аляксей Пяткевіч узяўся выкласці мае погляды на сувязь паміж думкай, характарам і сюжэтам у мастацкім творы. (Гл. яго артыкул «Думка — характар — сюжэт», ЛіМ № 77 за г. г.). Я быў бы вельмі ўдзячны за такую паслугу, але А. Пяткевіч ужыў недазволены прыём, і гэта сапсавала ўсю справу.

У артыкуле, на які спасылаецца А. Пяткевіч («Полымя», № 1, 1962 г.), я пісаў: «Будаваць сюжэт — гэта па сутнасці выбіраць толькі тыя падзеі, якія даюць магчымасць пісьменніку найбольш поўна ўвасобіць свой замысел, тыпізаваць у мастацкім чалавечым характары свае разнастайныя жыццёвыя назіранні. Само сабою зразумела, што ў мастацкім творы, як і ў жыцці, павінен быць непарыўны ланцуг падзей, інакш кажучы, яны павінны быць узаемазвязаны і ўзаемаабумоўлены паміж сабою. Каб не залазіць у акадэмічныя спрэчкі, можна звярнуцца да школьнай ісціны, даволі простай і зразумелай. Яна кажа: калі ў мастацкім творы нічога не адбываецца, значыць, ён бессюжэтны».

Я тут, вядома, не адкрыў нічога новага. Я сапраўды пераказаў думку з падручнікаў аб тым, што сістэма падзей абавязкова павінна быць у мастацкім творы, які будуецца на жыццёвым канфлікце. А ці бываюць творы бессюжэтныя, гэта значыць, без сістэмы падзей? Бываюць. Напрыклад, лірычныя вершы, у якіх перадаюцца перажыванні паэта, або апавяданні, якія малююць карціны прыроды.

Глядзіце, што зрабіў мой апанент з гэтым выказваннем.

А. Пяткевіч замяніў выраз «непарыўны ланцуг падзей» разуменнем «схема знешняга дзеяння», а замест слова «твор» напісаў «раман». Абвінавачанне гатова: «Сярод некаторай часткі крытыкаў яшчэ жыве погляд на сюжэт, як на схему знешняга дзеяння ў творы, раманы падзяляюцца на «сюжэтныя» і «бессюжэтныя». Р. Шкраба (гл. «Полымя», № 1, 1962 г.), напрыклад, лічыць, што «калі ў творы нічога не адбываецца (?!), значыць ён бессюжэтны» і «калі б уся справа была ў сюжэце, то прыгодніцкія аповесці і авантурныя раманы былі б самымі дасканалымі творамі». Для крытыка, як відаць, авантурна-прыгодніцкі твор — узор сюжэтнай дасканаласці».

Не, дарагі таварыш, так нельга рабіць. Вы вырвалі словы з розных кантэкстаў і сказілі іх сэнс.

У маім артыкуле гутарка ішла аб тым, што нельга надаваць сюжэту аўтаномнае значэнне. Я пярэчыў супраць Вашай спробы аднабакова і адвольна тлумачыць мастацкую недасканаласць вобразаў новых людзей у рамане «Лявон Бушмар». Замест таго, каб знайсці прычыны гэтай з'явы, Вы ўзвалілі ўсю віну на сюжэт. «Справа ў тым, — пісалі Вы, — што вобразы не атрымалі ў творы патрэбнага сюжэтнага ўвасаблення». «Ой, не, — пярэчыў я, — мусіць не так! Калі б уся справа была ў сюжэце, то прыгодніцкія аповесці або авантурныя раманы былі б самымі дасканалымі творамі!»

Сапраўды, як у той прыказцы: я яму пра Хаму, а ён мне — пра Ярэму.

«Атрымліваецца парадокс, — дадумвае за мяне А. Пяткевіч, — сюжэт дасканалы, а сапраўды мастацкага характару ў творы няма, сюжэт, значыць, — сам па сабе, а характар сам па сабе». Не, я гэтага не сказаў. Але хачу тут прывесці словы А. Фадзеева: «У рамане беларускага пісьменніка М. Паслядовіча «Святло над Ліпскам» ёсць цудоўныя жыццёвыя характары і няма сюжэта». Далей. Сюжэт рамана «Будучыня» Эд. Самуйлёнка больш стройны, чым сюжэт рамана «Трэцяе пакаленне» К. Чорнага. Тым не менш сацыяльны, філасофскі, псіхалагічны аналіз мастацкіх характараў К. Чорны зрабіў больш глыбока, чым Эд. Самуйлёнак. Чаму так здарылася? Прычын тут многа. Адна з іх — неадпаўкавая дасканаласць мовы — гэта значыць матэрыялу, з якога будуецца твор, і пісьменніцкага інструменту. З другога боку, бываюць творы з падобнымі сюжэтамі, але населеныя непадобнымі характарамі.

Я не думаю, што даўшы сюжэт «Мёртвых душ», А. С. Пушкін разам з ім даў М. В. Гогалю характары Чычыкава, Каробачкі, Сабакевіча, Наздрова, Манілава і даў якраз такімі, якімі мы іх ведаем з геніяльнага твора М. В. Гогаля.

Здзіўляе катэгарычнасць тэарэтычных вывадаў, якія робіць у сваім артыкуле А. Пяткевіч. Тым больш, што ён часам спрабуе выступаць не толькі ад свайго імя. «У сучасным літаратуразнаўстве, — упэўнена заяўляе аўтар, — сюжэт разглядаецца як шлях развіцця (руху) мастацкага характа-

[Заканчэнне на 4-й стар.].

У КЛУБАХ І БІБЛІЯТЭКАХ

У Кастрычніцкім раёне сталіцы закончыўся Тыдзень беларускай літаратуры і мастацтва. Рабочыя прамысловых прадпрыемстваў, чыгуначнага вузла, навучэнцы, хатнія гаспадыні знаёміліся з беларускімі пісьменнікамі, кампазітарамі і выканаўцамі беларускіх твораў.

На камвольным камбінаце пабывалі кампазітары Д. Камінскі, Г. Вагнер. Яны расказалі аб развіцці музычнага мастацтва рэспублікі, падзяліліся творчымі планамі. Артысты філармоніі выканалі папулярныя песні кампазітараў. У хіміка-тэхналагічным інстытуце імя Кірава адбылася сустрэча студэнтаў з паэтамі А. Лойкам, Н. Кіслікам, Г. Бураўкіным.

Маладыя будаўнікі сустрэліся са студэнтамі тэатральна-мастацкага інстытута. Будучыя артысты паказалі спектакль «Ягор Булычоў» па п'есе М. Горкага.

У рабочых клубах і бібліятэках былі наладжаны кніжныя выстаўкі, праводзіліся гутаркі аб лепшых творах беларускіх пісьменнікаў і кампазітараў. Больш 200 будаўнікоў наведалі Дзяржаўны мастацкі музей.

Тыдзень беларускай літаратуры і мастацтва прайшоў цікава і змястоўна.

НА БАЛГАРСКАЙ МОВЕ

Кожны год у выдавецтвах Балгарскай Народнай Рэспублікі выходзяць кнігі беларускіх аўтараў. Сёлетні год асабліва ўраджайны: ужо выйшлі з друку томік вершаў Максіма Танка (пераклады Н. Вычава і І. Давыдкава), аповесць В. Быкава «Трэцяя ракета» (пераклад Д. Жэкавай), зборнік беларускіх народных казак «Цудоўная дудка» (пераклады Г. Вычава і Д. Мінчавай), п'есы А. Макаёнка «Лявоніха на арбіце» і А. Маўзона «Калі ты чалавек» (у адным зборніку, пераклады Л. Паспалеева і Ю. Паповай).

Да канца года ў Сафіі будзе выданы таксама зборнік сучасных беларускіх апавяданняў і томік выбранай лірыкі Пімена Панчанкі.

ДЫЯЛОГ З ТАВАРЫШАМ

(Заканчэнне. Пачатак на 3-й стар.).

ру ў творы». Я мог бы прывесці не адно і не пяць выказванняў і саміх майстроў мастацкага слова і літаратуразнаўцаў, якія лічаць, што сюжэт апавядання складваецца з учынкаў героя, што сюжэт п'есы — ёсць жыццёвае перапляценне падзей і сутыкненняў, якое вынікае з галоўнага канфлікту твора, што сюжэтам эпічнага твора называецца паказ развіцця таго ці іншага канфлікту ў пэўнай сістэме падзей, што сюжэт — гэта даследаванне характару праз падзеі. Я знарок не называю аўтараў гэтых выказванняў. Давайце, паважаны аўтар, паразважаем самі, чаму Ваша вызначэнне недакладнае. Ну, добра, сюжэт—гэта шлях развіцця характару. А як быць з тымі творамі, у якія герой прыходзіць з ужо сфарміраваным характарам, і пісьменнік толькі раскрывае гэты характар, а не паказвае, як ён змяняецца? Ці ёсць такія творы? Вазьміце, каб далёка не хадзіць, хоць бы аповесць А. Салжаніцына «Адзін дзень Івана Дзянісавіча». Ці змяняецца характар Івана Шухава на працягу твора? Не, не змяняецца, ды ён і не можа змяніцца за адзін дзень. Тым не менш, чытач добра ўяўляе яго характар, бо пісьменнік нам раскрывае яго праз тыя падзеі і сітуацыі, у якія ён трапляе. Вы, відаць, не скажаце, што гэта твор бессюжэтны. Ёсць у ім і ідэя, і канфлікт, і ўсё, што павінна быць у мастацкім творы.

Вельмі прамалінейна таксама разважае А. Пяткевіч, спрабуючы вызначыць асноўнае ў сюжэце. Мне здаецца, наогул нельга ставіць пытанне так, як яго ставіць аўтар: «асноўнае ў сюжэце — не само дзеянне ў яго знешнім праяўленні, а чалавечы характар, рух якога выклікае да жыцця гэтае дзеянне». Перш за ўсё, каб зрабіць абагульненне, нельга браць з'яву, якая можа мець многа станаў, толькі ў адным яе стане. А. Пяткевіч разглядае толькі дзеянне ў знешнім праяўленні. мне ніхто не забараняе браць дзеянне, якое вынікае з логікі барацьбы, узгадняецца з ідэяй, якую рэалізуе аўтар, і памагае лепш паўней раскрыць свет героя.

А. Пяткевіч гаворыць, што асноўнае ў сюжэце — характар. Нехта другі скажа, што асноўнае — дзеянне. Абодва вывады аднабаковыя і таму няправільныя.

Другая памылка А. Пяткевіча, на маю думку, у тым, што ён падзеі ў мастацкім творы разглядае як нешта вытворнае ад характару (рух чалавечага характару выклікае да жыцця дзеянне).

Ці заўсёды так бывае? Не, далёка не заўсёды. Герой рамана А. Адамовіча Толя Корзун трагічна гіне ў самым канцы дылогіі, калі ўсе пакуты і выпрабаванні мінулі, калі ён стаяў на парозе новага шчаслівага жыцця. У сюжэце твора гэта падзея мае сваю логіку.

Паводле А. Пяткевіча выходзіць, што ў самім характары Толі было нешта такое, што абумовіла яго трагічную смерць. Які рух яго характару, гаворачы яго словамі, выклікаў да жыцця гэтае дзеянне? Так разважаць нельга, інакш мы забрыдзем у такія схаластычныя нетры, што ніяк не выберамся на правільную дарогу.

Сюжэт — гэта не замкнутая сфера. Як карэнне ў глебу — у яго ўрастае ідэя, канфлікт, характары, на яго кладуць свае адзнакі: светапогляд пісьменніка, яго мастацкія схільнасці і густы, яго грамадзянская пазіцыя і г. д. Нездарма А. П. Чэхаў казаў, што на адзін і той жа сюжэт могуць напісаць дваццаць аўтараў і ў іх будуць розныя творы.

Некалькі заўваг пра падыход А. Пяткевіча да аналізу мастацкіх твораў. А. Пяткевіч уяўляе сабе творчы працэс такім чынам. Васіль Быкаў разумее, што знешняя займальнасць — гэта дрэнна. Таму такі стройны сюжэт і добра выпісаныя характары ў яго «Альпійскай баладзе». Разумее і Алесь Адамовіч, што не трэба гнацца за эфектнымі знешнімі падзеямі, таму і ў яго з сюжэтам і займальнасцю ўсё нармальна. Аляксей Кулакоўскі, наадварот, не разумее, што таннае прыгодніцтва шкодзіць мастацкаму твору, таму некаторыя сцэны свайго рамана «Сустрэчы на ростанях» ён пісаў з «разлікам на знешні эфект». На самай справе, праблема куды больш складаная. Адна справа — пабудаваць сюжэт невялікай аповесці з невялікай колькасцю дзеючых асоб, другая справа—пабудаваць сюжэт мнагапланавага рамана, які ахоплівае многа людзей, дзеянне якога разгортваецца на вялікай прасторы і на працягу значнага часу. Прыгадайце выказванне Л. Талстога: «Вы не можаце сабе ўявіць, якая цяжкая для мяне гэтая папярэдняя работа глыбокага ворыва таго поля, на якім я **вымушаны** сеяць. Абдумаць і перадумаць усё, што можа здарыцца з усімі будучымі людзьмі будучага твора, вельмі вялікага, і абдумаць мільёны магчымых спалучэнняў для таго, каб выбраць з іх адну мільённую, жахліва цяжка».

Я далёкі ад думкі, што А. Адамовічу ўдалося знайсці самы дасканалы сюжэт для свайго рамана. Але я таксама не думаю, што А. Кулакоўскі пісаў з разлікам на знешні эфект і што на падставе яго вопыту нельга весці гаворку аб праблеме сюжэта.

Мне ўяўляецца вельмі няплённай і марнай справай дадумванне за аўтара. Бачыце, В. Быкаў напісаў добры твор, бо знарок унікаў знешняй займальнасці. А калі б ён «паказаў толькі знешні бок падзей, прасачыў бы толькі самі прыгоды ўцекачоў з канцлагера, то твор, нягледзячы на яго займальнасць, застаўся б павярхоўнай ілюстрацыяй вядомай тэмы». Па-першае, не трэба ніколі, нават у думках, уяўляць сабе пісьменніка менш таленавітым, чым ён ёсць на самай справе. Па-другое, нельга да сапраўды мастацкіх твораў падыходзіць з такім крытэрыем займальнасці, якім дарэчы вымяраць прыгодніцкія творы, зробленыя рамеснікамі халодным спосабам. Па-трэцяе... патрэцяе, усё гэта вельмі нагадвае паводзіны аднаго чуллівага чалавека, якога займала пытанне: што здарыцца, калі людзі наядуцца талакна. Яму ўявілася, што ад гэтага ногі ў іх зробяцца тоненькія-тоненькія, і яму стала шкада людзей...

У мастакоў слова ёсць нямала творчых пытанняў, па якіх трэба спрачацца. Але і спрачаючыся, і крытыкуючы адзін аднаго, і нават часам крыўдуючы адзін на аднаго, нам заўсёды трэба памятаць пра тую справу, якой мы служым. Нядаўні пленум праўлення Саюза пісьменнікаў БССР, прысвечаны праблемам беларускага рамана, яшчэ раз пасведчыў, што спрэчка з прынцыповых пазіцый ідзе на карысць літаратуры, памагае пісьменнікам у творчай працы.



ВОСЕНЬ. Фотаэцюд Ч. Мезіна. (БЕЛТА).

КЛУБ ЮНЫХ АМАТАРАЎ МАСТАЦТВА

У апошнюю суботу верасня ў Музей выяўленчых мастацтваў імя А. С. Пушкіна прыйшлі каля 500 вучняў 8—10 класаў. Тут адбылася першая сустрэча будучых членаў клуба юных мастацтвазнаўцаў. Ён створаны пры музеі, і ў ім школьнікі знаёмяцца з творамі зарубежнага мастацтва розных эпох і народаў.

Клуб нарадзіўся восем гадоў назад. І кожны год ён адраджаецца нанава з прыходам новых дзяцей.

На ўрачыстым сходзе вучні сустрэліся з навуковымі супрацоўнікамі і членамі клуба мінулых гадоў. «Ветэраны» расказалі аб сваіх планах і склаўшыхся традыцыях.

Па сутнасці, клуб — сапраўдны універсітэт культуры для дзяцей. Тут чытаюцца лекцыі, праводзяцца семінары, на якіх школьнікі робяць самастойныя даклады і абмяркоўваюць іх. Клуб мае сваё праўленне, статут і членскія білеты.

Што ж будуць вывучаць дзеці ў сваім універсітэце сёлета? Яны даведаюцца аб культуры старажытнага Егіпта і Грэцыі, убачаць творы вялікіх майстроў Адраджэння, пазнаёмяцца з мастацтвам Галандыі XVII стагоддзя, з французскімі мастакамі розных школ, з сучасным мастацтвам капіталістычных краін. Праграма клуба, вядома, не абмяжоўваецца толькі зарубежным мастацтвам. Дзеці будуць тут спрачацца і гаварыць аб усім, што іх хвалюе, хадзіць на выстаўкі ў іншыя музеі, у майстэрні савецкіх мастакоў. Члены клуба пабываюць у старажытных рускіх гарадах, пазнаёмяцца з іх цудоўнай архітэктурай.

Вывучыўшы асновы мастацтва, дзеці панясуць свае веды далей: у школу, у піянерскі лагер, куды яны паедуць летам, у клубы сваіх дамоў. Яны памогуць наладжваць там гутаркі, лекцыі, будуць вадзіць сваіх таварышаў на выстаўкі.

АДН.

Золатам кранута лістота. Для мастака гэта пара — найлепшы час для працы. Не губляе ніводнага дня і магілёўскі мастак Мікалай Аляксееў. Вы сустрэнеце яго ў Пячэрскім лесапарку, у маляўнічым Любужы і іншых цудоўных мясцінах, дзе восень паклала свае барвы. Наш няштатны фотакарэспандэнт Е. Карклін зняў мастака за працай.

МЕМАРЫЯЛЬНАЯ ДОШКА ГАШАКУ

У сталіцы Башкірыі, Уфе, устаноўлена мемарыяльная дошка Яраславу Гашаку. Імя чэхаславацкага пісьменніка, аўтара неўміручых «Прыгод бравага салдата Швейка», жыхарам гэтага горада асабліва дарагое.

Сорак пяць гадоў назад з часцямі 5-й арміі Усходняга фронту Яраслаў Гашак прыбыў ва Уфу. Тут ён загадваў друкарняй армейскіх газет «Наш шлях» і «Чырвоны стралок». На працягу васьмі месяцаў, праведзеных у Уфе, Гашак стварыў рад вострых сатырычных і публіцыстычных твораў, накіраваных супраць ворагаў рэвалюцыі.

На мемарыяльнай дошцы з уральскага граніту залатымі літарамі на рускай і башкірскай мовах высечаны надпіс:

«У гэтым будынку ў 1919 годзе перад байцамі Інтэрнацыянальнай брыгады выступаў чэшскі пісьменнік-камуніст Яраслаў Гашак».

АДН.

Стружка

(Заканчэнне. Пачатак на 2-й стар.)

ў той жа час патрабавальны і прынцыповы чалавек.

Гэта вельмі справядлівыя словы. Але праўда і тое, што і цяпер яшчэ ў нас ёсць людзі, якія жывуць старымі ўяўленнямі і ўсё на свеце мераюць старымі меркамі. Праўда, іх не заўсёды лёгка раскусіць. Аддаючы даніну часу, яны з ахвотай казыраюць моднымі фразамі, назубок ведаюць усе пастановы, што датычацца ўкаранення ленінскіх прынцыпаў кіраўніцтва, пры словах «савецкі чалавек» напускаюць на твар урачысты выраз. Але добра пазнаёмцеся з такім чалавекам, і вы пераканаецеся, што недзе ў глыбіні душы ён лічыць усё гэта «штучкамі-дручкамі», аб якіх трэба гаварыць, але якія толькі перашкаджаюць у практычнай рабоце.

Паглядзіце на яго дзе-небудзь на пасяджэнні ці калі ён выклікае людзей у свой кабінет. Усе напружаны, затлумлены, ні ўсмешкі, ні спакойнага слова.

...Дырэктар саўгаса «Загор'е» Мікалай Мікалаевіч Гурскі здаўна лічыцца ў раёне моцным кіраўніком. Ён і вонкава пакідае прыемнае ўражанне — хударлявы, з ваеннай выпраўкай, з сухаватым, загарэлым тварам, на якім пабліскваюць невялікія шэрыя вочы.

Неяк у канцы чэрвеня (гэта было сёлета) у гарачы, сухі дзень, калі зямля, здавалася, трэскалася ад спякоты, я паехаў у «Загор'е», каб паглядзець, як там даглядаюць пасевы.

У саўгаснай канторы — вялікім драўляным доме, абвешаным і абклееным плакатамі і лозунгамі (тут і заклікі да прайшоўшага першамайскага свята, і правілы супрацьпажарнай бяспекі, і правілы «апрацоўкі» жывёлы супраць аваднёў і г. д.) нікога, акрамя дзяўчыны-рахункавода, не было.

— Начальства недзе паехала па брыгадах, — коратка паведаміла мне яна.

Я выйшаў на ганак і ўзрадаваўся—сцежкаю насустрач ішоў невысокі паўнаваты мужчына з круглым добразычлівым тварам, упраўляючы цэнтральнага аддзялення Васіль Мікалаевіч Яскевіч. «Пашанцавала, — падумаў я, — аддзяленне Васіля Мікалаевіча заўсёды ідзе ўперадзе. Можна будзе даць у сваю газету выступленне ўпраўляючага».

Я сказаў яму аб гэтым. Васіль Мікалаевіч пачырванеў ад задавальнення.

— А што, можаце праехаць па палетках, самі ўбачыце, пасевы ва ўзорным парадку — і кукуруза, і бульба, і буракі. Усё гэта заслуга механізатараў. Цудоўныя хлопцы працуюць.

Мы селі на лаўку ў халадок, і я ўзяўся запісваць. Інтэрв'ю падыходзіла пад канец, калі ля канторы спыніўся газік. З яго вылез дырэктар і накіраваўся быў у памяшканне, але, угледзеўшы нас, спыніўся і злосна спытаў:

— Што ты там заліваеш карэспандэнту?!

Твар Васіля Мікалаевіча адразу стаў мокры.

— Чаму вы так гаворыце, Мікалай Мікалаевіч? — ціха спытаў ён.

— Ах, дык табе яшчэ незразумела чаму? — расцягваючы словы, сказаў дырэктар. — Ды я цябе, нягодніка, з работы здыму, пад суд аддам. Чаму ў аддзяленні пасевы запушчаны?

— Дзе ж гэта яны запушчаны, Мікалай Мікалаевіч? — спытаў упраўляючы.

— Яшчэ пытаешся дзе? — грымеў дырэктар. — Чаму на кукурузе з раніцы трактар не працуе? Я загадаў, каб ён працаваў, ці не? Адказвай.

— Дык яго ж галоўны аграном у іншае месца перакінуў.

— А ты навошта? Дзе твае мазгі былі ў гэты момант? — Дырэктар дадаў некалькі нецэнзурных выразаў і хутка падняўся па прыступках у кантору.

Упраўляючы, якому, відаць, было вельмі няёмка перада мной за ўсю гэтую сцэну, збянтэжана ўсміхаючыся, нешта прамармытаў, падняўся з лаўкі і пайшоў прэч.

Я зайшоў у кабінет дырэктара. Мікалай Мікалаевіч перагортваў паперкі.

— Сапсавалі вы мне інтэрв'ю, — знарок бадзёрым голасам сказаў я. — Цудоўны матэрыял атрымаўся б. Да таго ж, я хацеў яшчэ падскочыць у брыгаду і зрабіць некалькі фотаздымкаў.

— Чаму сапсаваў? — падняў галаву Мікалай Мікалаевіч.

— Як гэта чаму; вы ж лаялі ўпраўляючага за тое, што пасевы занядбаны.

Дырэктар весела ўсміхнуўся:

— Пасевы ў яго аддзяленні ў выдатным стане. А стружку здымаў для таго, каб надта не задаваўся. У нас, браце ты мой, народ такі, што ўвесь час трэба ў напружанні трымаць, а не, дык і толку не будзе.

— Але ж чалавек пакрыўдзіўся,—не мог супакоіцца я.

— Па-а-крыўдзіўся? — расцягнуў Мікалай Мікалаевіч і зарагатаў. — Нічога, нічога, толькі карысць ад гэтага будзе. Бачылі, як яго ў пот кінула пасля маіх слоў. Мусіць, адразу пабег на поле, каб праверыць, ці праўду я казаў...

— Ну, а калі ўпраўляючы па вашаму прыкладу там, на полі, накінецца з лаянкай на невінаватага ні ў чым рабочага, што тады будзе?

— А нічога. Няхай і ён здыме са сваіх падначаленых трохі стружкі. Таксама не пашкодзіць.

— Ну, а рабочым з каго гэтую стружку здымаць? — спытаў я.

— Рабочым? — дырэктар здзіўлена паглядзеў на мяне і, пацiснуўшы плячыма, ўстаў з-за стала:

— Выбачайце, мне трэба ехаць у брыгаду...

Я ехаў дадому і думаў, адкуль бяруцца ў такіх, як Гурскі, уяўленне, быццам на кіруючай пасадзе нельга глядзець на жыццё па-чалавечы, проста, бачыць вакол сябе перш за ўсё не падначаленых, не матэрыял для здымання стружкі, а таварышаў па рабоце, паплечнікаў па справе.

У начальніка, заражонага вірусам адміністрацыйнага свербу, заўсёды напагатове апраўданне — раблю так дзеля справы. Маўляў, без строгасці ў нашым становішчы ніяк нельга.

Але ўсё гэта не мае ніякага дачынення да строгасці (я маю на ўвазе прынцыповую, сапраўдную строгасць). Ёсць розніца паміж кіраўніком, аб якім гавораць — ён строгі, але справядлівы, і кіраўніком, пра якога, перш чым увайсці ў кабінет, пытаюцца ў сакратаркі: у якім сёння настроі шэф.

Мне здаецца, што звычка да «стружказдымання» нараджаецца тады, калі чалавек ні на адну мінуту не можа забыцца аб тым, што ён начальнік. Ёсць людзі, у якіх адно адчуванне таго, што яны маюць уладу, няхай нават самую мікраскапічную, ускружвае ім галаву. Быў чалавек, як чалавек, а падняўся на адну прыступку, і людзі вакол пачынаюць пацiскаць плячыма — не падступіцца да яго.

Я ведаю дырэктара аднаго саўгаса — гэта яшчэ даволі маладая жанчына,— якая першай ніколі не павітаецца з чалавекам, няхай сабе нават намнога старэйшым за яе. Калі ёй аб гэтым аднойчы сказалі на партыйным сходзе, то пачулі ў адказ:

— Я дырэктар і павінна берагчы свой аўтарытэт. А то на галаву ўзлезуць.

Між іншым, у кабінет да яе ідуць, як на эшафот.

Як тут не ўспомніць словы Уладзіміра Ільіча Леніна: «У народнай масе мы ўсё ж кропля ў моры і мы можам кіраваць толькі тады, калі правільна выказваем тое, што народ усведамляе».

Шкада становіцца тых людзей, якія ўяўляюць сябе морам, а мора кропелькай.

Мінскі раён.

ТЭМА ДАСЛЕДАВАННЯ— МУЗЫЧНЫ ТЭАТР

(Заканчэнне. Пачатак на 3-й стар.).

ацэнцы гэтых твораў Б. Смольскі карыстаецца такімі выразамі, як: «...беднасць аркестроўкі. недастатковая ўвага кампазітара да індывідуальнай характарыстыкі вобразаў, слабасць развіцця тэматычнага матэрыялу...». «...супярэчлівасць музыкі і дзеяння...», «...схематычныя вобразы, слабая аркестроўка, прымітыўная фактура музычнага ізлажэння...». «...Музыка губляе сваю самабытнасць і арыгінальнасць... у ёй адчуваецца сентыментальнасць, а то і дрэнны густ...» і г. д. і да т. п.

Вядома, усе гэтыя творы не пазбаўлены тых ці іншых недахопаў. Але яны ж, гэтыя творы, гістарычна падрыхтавалі паяўленне новых, лепшых у ідэйна-мастацкіх адносінах беларускіх опер і балетаў, адзначаных больш высокім кампазітарскім майстэрствам. Таму, разглядаючы іх з прынцыпова крытычных пазіцый, трэба было ўсё ж адзначыць, што яны адыгралі значную ролю ў станаўленні нацыянальнага мастацтва, мелі ў свой час надзвычай важнае значэнне і склалі цэлы перыяд у гісторыі беларускай музыкі.

Разам з гэтым мае вялікую рацыю музыказнаўца, калі робіць слушны папрок у адрас тэатра за неапраўданае эксперыментатарства з балетам В. Залатарова «Князь-возера». Пабудаваныя на музычным матэрыяле гэтага балета яго новыя варыянты («Аповесць аб каханні» і «Палымяныя сэрцы») не толькі не ўдасканалілі спектакля, а наадварот—значна пагоршылі, калі зусім не сапсавалі яго.

Слушна крытыкуецца тэатр і за няўвагу да асобных твораў беларускай опернай музыкі, у выніку чаго так і не ўбачылі святла рампы оперы «Машэка» Р. Пуксты, «Андрэй Касценя» М. Аладава, «Павел Карчагін» П. Падкавырава, «Раскіданае гняздо» М. Чуркіна.

У прадмове Б. Смольскі піша: «У кнізе намечаны толькі вузлавыя моманты гісторыі музычнага тэатра. Яна не прэтэндуе на вычарпальны характар даследавання». Аднак не гледзячы на гэтае залішне сціплае сцвярджэнне, увесь характар кнігі гаворыць аб тым, што яна з'яўляецца даволі значнай працай (і пры гэтым—першай працай) аб беларускай музычна-тэатральнай культуры. А таму і патрабаванні да яе павінны быць адпаведна высокія. Але ці задавальняе кніга гэтыя патрабаванні? У асноўным—так, аднак тое-сёе ў ёй выклікае пярэчанні.

Ужо сам загаловак кнігі—«Беларускі музычны тэатр»—не зусім адпавядае яе зместу. Па-за ўвагай аўтара засталася даволі значная галіна музычнага тэатра—музычная камедыя.

Шкада таксама, што аўтар не палічыў патрэбным хоць коратка ахарактарызаваць беларускія оперы, непастаўленыя на сцэне, але якія прагучалі па радыё («Машэка», «Андрэй Касценя», «Павел Карчагін»).

Опера—музычны твор. І калі пра яе вядзецца прафесіянальная размова на старонках спецыяльнага выдання, дык хацелася б бачыць глыбокі музыказнаўчы аналіз, пераканаўчую ацэнку канкрэтных мастацкіх з'яў, пад уздзеяннем якіх фарміраваўся беларускі музычны тэатр. На жаль, такіх абагульненняў у працы Б. Смольскага не так ужо многа—хутчэй тут знойдзеш агульныя часцей за ўсё стандартныя фармуліроўкі. Так, разглядаючы творы беларускіх кампазітараў, аўтар падрабязна пераказвае змест лібрэта, робіць даволі беглы разгляд музыкі, ацэньвае працу рэжысёра (у большасці выпадкаў—станоўча) і асобных выканаўцаў, а ў канцы, як бы саромеючыся зробленых заўваг, гаворыць, што новая пастаноўка была «крокам наперад», «радаснай з'явай» і г. д. Такім чынам, на пытанні аб тым, як развівалася оперная творчасць беларускіх кампазітараў, як ад спектакля да спектакля ўдасканальвалася іх прафесіянальнае майстэрства, што дала тэатру нацыянальная кампазітарская школа, чытач адказу амаль не атрымлівае. Не закрануты ў кнізе і цэлы рад вострых, надзённых праблем развіцця нашага музычнага тэатра.

Галоўная фігура музычнага тэатра—дырыжор, ад мастацкіх густаў, таленту і прафесіянальных якасцей якога ў большасці залежыць аблічча любога музычнага калектыву. За трыццаць з лішнім гадоў беларускай оперы змянілася нямала таленавітых музычных кіраўнікоў, і кожны з іх пакінуў сваю адметную старонку ў гісторыі тэатра. Аднак пра творчыя метады асобных дырыжораў у кнізе сказана вельмі скупа. Пры разглядзе большасці спектакляў прозвішчы дырыжораў у тэксце наогул адсутнічаюць, і для таго, каб даведацца аб іх, трэба ўвесь час глядзець у спіс рэпертуару.

Тыя ж характарыстыкі творчасці дырыжораў, якія трапілі на старонкі кнігі, занадта ўжо кароткія, а часам нават непрафесіянальныя. Напрыклад, Б. Смольскі піша: «Пірадаў паказаў сябе вельмі тэмпераментным дырыжорам, які валодае дакладным рытмічным дараваннем. Цяжкасці аркестравай партыі пераадольвалі с я лёгка і непрыкметна. Чулы і карэктны ў акампанемен е ні-це, ён даваў магчымасць аркестру моцна гучаць у інструментальных нумарах і эпізодах».

Безумоўна, такая «характарыстыка» не раскрывае творчы метад такога выдатнага дырыжора, як Пірадаў, які вылучаўся дакладнасцю ў выкананні партытуры, высокай музычнай культурай, выключнай памяццю, які з аднолькавым натхненнем і своеасаблівай «святочнасцю» дырыжыраваў і прэм'ерай, і сотым спектаклем і заўсёды мог «заразіць» сваім запалам спевакоў і аркестрантаў.

Многія імёны майстроў беларускай опернай сцэны сталі надзвычай папулярнымі ў рэспубліцы і далёка за яе межамі. Натуральна, што чытачы хацелі б знайсці ў кнізе цікавыя факты з жыцця і сцэнічнай дзейнасці сваіх любімых артыстаў. Прозвішчаў сапраўды названа нямала. Аднак звесткі аб асобных салістах-спеваках досыць абмежаваныя. Пра індывідуальныя выканаўчыя рысы кожнага з іх гаворыцца мала, характарыстыкі вельмі падобныя адна на адну.

Амаль нічога не сказана аб канцэртмайстрах тэатра, на плечы якіх звычайна кладзецца велізарная падрыхтоўчая работа. Нельга атрымаць пэўнае ўяўленне і аб творчым абліччы аркестравага калектыву, яго асобных таленавітых выканаўцах, якія аддалі служэнню беларускаму музычнаму мастацтву амаль усё жыццё.

Наогул, калі першая частка кнігі чытаецца з увагаю, бо змяшчае многа цікавага матэрыялу, то другая, аб паслярэвалюцыйным музычным тэатры, пакідае ўражанне залішняй стракатасці. Відаць, гэта тлумачыцца тым, што аўтар, маючы пад рукамі вялікую колькасць матэрыялу, імкнуўся як мага больш «упіхнуць» яго ў кнігу. Гэта і прывяло да скорагаворкі, паспешлівых пералікаў. Чытач літаральна «тоне» ў дзесятках назваў опер і балетаў, сотнях прозвішчаў рэжысёраў, мастакоў, салістаў і, безумоўна, разгубліваецца ў гэтым вялізным «памінальніку». Напрыклад, на 179 старонцы змешчана сорак два прозвішчы, на 224 старонцы — шэсцьдзесят чатыры і г. д.

Даволі бедная, невыразная мова кнігі. Адны і тыя ж сказы, азначэнні бясконца вандруюць са старонкі на старонку. Цяжка нават падлічыць, колькі разоў, пры ацэнцы спектакляў, музыказнаўца карыстаецца сказамі: «новае дасягненне», «вялікая творчая ўдача», «заслужаны поспех», «узрослая выканаўчая культура», «узбагачанае майстэрства» і г. д. Можна падумаць, што ўсе спектаклі тэатра—бясконцы шэраг дасягненняў, удач, поспехаў, а для выканаўчага майстэрства калектыву адно і характэрна, што яно «ўзрастае», «узбагачаецца» ды «вытрымлівае экзамен на сталасць».

Тое ж можна сказаць і пра характарыстыку выканаўцаў асобных партый. «Сур'ёзнага поспеху дасягнуў», «ярка раскрыў», «бліскуча праявіў», «знайшоў верны шлях», і асабліва—«пераканаўча паказаў»—так і стракацяць на ўсіх старонках, а часам трапляюцца і такія перлы: «...артыст пераканаўча падкрэсліваў унутраную перакананасць...» (стар. 142).

Ёсць у кнізе і асобныя недакладнасці. Так, Маддалена з оперы «Рыгалета» ператварылася чамусьці ў Магдалену. У вельмі цікавым і вялікім спісе рэпертуару беларускага музычнага тэатра, у якім ёсць і дата прэм'еры, і прозвішчы кампазітара, дырыжора, рэжысёра, мастака чамусьці адсутнічаюць прозвішчы аўтараў лібрэта. Ёсць у гэтым спісе і іншыя недакладнасці. Дырыжорам-пастаноўшчыкам оперы «Фауст» (1950 г.) памылкова названа Т. Каламійцава, у той час, калі ставіў спектакль І. Гітгарц. Пастаноўка «Царскай нявесты» ў тым жа годзе прыпісваецца Л. Худалею, а на самай справе дырыжыраваў В. Пірадаў (дарэчы аб гэтым жа гаворыцца і на старонцы 155, а на 160 аўтар піша, што Л. Худалей быў запрошаны ў тэатр толькі ў 1951 годзе). Застаецца незразумелым, чаму, расказваючы пра мантаж «У купальскую ноч», выкананы ў 1949 годзе, Б. Смольскі гаворыць, што ў яго ўвайшлі фрагменты з опер «Міхась Падгорны», «Кветка шчасця» і балета «Салавей», а ў спісе рэпертуару называе спектакль нібыта пастаўленага тэатрам у 1942 годзе балета М. Крошнера «На купалле». Што гэта — розныя рэчы, ці гаворка ідзе аб адным і тым жа?

І ўсё ж, мне здаецца, што, нягледзячы на рад істотных недахопаў, кніга «Беларускі музычны тэатр» патрэбная і карысная. Яна дае многа звестак аб развіцці нашага музычнага мастацтва і будзе з цікавасцю чытацца не толькі прафесіянальнымі музыкантамі, тэатральнай грамадскасцю і студэнтамі мастацкіх навучальных устаноў, але і самымі шырокімі коламі чытачоў.

Дзмітрый ЖУРАЎЛЁЎ.

Тэлебачанне

23 кастрычніка

Першая праграма. 11.00—«Агні фестывалю». Фільм-канцэрт. 18.05 — праграма перадач. 18.10—тэлевізійныя навіны. 18.30—«Расказы аб гераізме». Выступленне пісьменніка С. Смірнова. 19.00—шырокаэкранны мастацкі фільм «Лабірынт сэрца». 20.30—тэлевізійныя навіны (М). 21.00—на XVIII летніх Алімпійскіх гульнях у Токіо (М). 22.00—«На агеньчык». Перадача з Масквы.

Другая праграма. 16.35—праграма перадач (М). 16.40—для школьнікаў. «Школа пачынаючага спартсмена» (М). 17.10—для малых. «Умелыя рукі» (М). 17.40—тэлевізійны эканамічны веснік (М). 18.30 — «Арыентацыя ў прасторы», «Асцярожна: радыёактыўнасць». Кінанарысы 19.00—Г. Бенгш. «Начное дзяжурства». Тэлеспектакль (М). 20.30—«Моды 1965 года». Паказвае аб'яднанне «Прагрэс».

24 кастрычніка

Першая праграма. 11.00 — мастацкі фільм «Лабірынт сэрца». 17.00 — праграма перадач. 17.05—для малых. Мультыплікацыйны фільм. 17.35—«Навіны з блакітнага экрана». 18.25—«Жывыя і мёртвыя». Мастацкі фільм. 1-я серыя. 20.00 — тэлевізійныя навіны (М). 20.30—на XVIII летніх Алімпійскіх гульнях у Токіо (М). 22.00—«На агеньчык». Перадача з Масквы.

Другая праграма. 16.45—праграма перадач. (М). 16.50—для дашкольнікаў і малодшых школьнікаў. В. Ліфшыц. «Слон і Зоя». Спектакль Тульскага тэатра лялек (М). 17.40—тэлевізійная афіша (М). 18.00—«Веды». Навукова-папулярная праграма (М). 19.00—тэлевізійны клуб кінападарожжаў (М). 20.00—канцэрт арганнай музыкі.

25 кастрычніка

Першая праграма. 11.10—праграма перадач. 11.15—для дзяцей. «Адкуль у твой дом прыходзіць талерка». Кінафільм. 11.30—для малышоў. «Тайна далёкага вострава». Мультыплікацыйны фільм. 12.00—для дзяцей. «Песні, музыка, танец». Перадача з Будапешта». 13.00—для школьнікаў. «Я раскажу вам пра паэта». 13.30—для дзяцей. Мастацкі фільм. «Мэта падарожжа—Эрфурт». 14.35—кінанарыс «У шаснаццаць хлапечых гадоў...» 14.55—праграма перадач. 15.00—для воінаў Савецкай Арміі і Флоту. «Баявое юнацтва». Тэлечасопіс. 16.30—кінанарысы. «Асенніх напевы». «Цясніна Рыоні». 17.00—канцэрт па заяўках. 17.40—«Сустрэчы з цікавымі людзьмі». Расказ пра творчасць самадзейных кампазітараў А. Ізотава, М. Кашубы, М. Наважылава і П. Шыдлоўскага. 18.20—мастацкі фільм «Жывыя і мёртвыя». 2-я серыя. 20.00—Футбол. «Дынама» (М)—«Дынама» (Мінск) (М). 20.45—тэлевізійныя навіны (М). 21.15—на XVIII летніх Алімпійскіх гульнях у Токіо (М).

Другая праграма. 10.40—«Зачараваны хлопчык». Мультфільм (М). 11.25 — «Гэтых дзён не змоўкне слава». А. Гайдар. «Няхай свеціць» (М). 14.30 — «Музычны кіёск» (М). 15.00—для воінаў Савецкай Арміі і Флоту (М). 15.30—мастацкі музей імя Чарлёніса. Перадача з Каўнаса. 16.15—літаратурныя экранізацыі, М. Лермантаў. «Маскарад» (М). 17.00—праграма Ашхабадскай студыі тэлебачання (М). 20.00—мастацкі фільм «Укралі бомбу».

26 кастрычніка

Першая праграма. 11.00 — «Яго звалі Фёдар». Кінанарыс. 16.35 — праграма перадач. 16.40 — для старэйшых школьнікаў «Сябрам дзесятай музы». 17.40 — тэлевізійныя навіны. 18.00 — «Будаўнікі дарог». Кінанарыс Беларускага тэлебачання. 18.20 — «Маладыя гаспадыні фермы». Тэленарыс аб маладзёжнай брыгадзе калгаса «Перамога» Дзяржынскага раёна. 18.30 — дакументальны фільм «Адрас бомбы вядомы». 19.00 — К. Чорны. «Трэцяе пакаленне». Прэм'ера спектакля Беларускага тэлебачання. 21.30 — тэлевізійныя навіны (М). 22.00 — кінаканцэрт.

Другая праграма. 17.20 — праграма перадач (М). 17.25 — для школьнікаў. «Камсамольскія весткі» (М). 17.35 — для школьнікаў. «Краіна Піянерыя, горад Акцябрацк». Тэлефільм (М). 17.55 — для дашкольнікаў і малодшых школьнікаў. «Машанька і мядзведзь» (М). 18.30 — тэлевізійныя навіны (М). 18.40 — «Час і людзі». Тэлевізійны летапіс (М). 19.30 — В. Пісталенка. «Трафовы кароль». Тэлеспектакль (М). 21.30 — тэлевізійныя навіны (М). 22.00 — вечар камернай музыкі. У праграме творы Рахманінава (М).

ПАЧАЛАСЯ ПАДПІСКА НА ГАЗЕТЫ І ЧАСОПІСЫ НА 1965 ГОД

НЕ ЗАБУДЗЬЦЕ СВОЕЧАСОВА ВЫПІСАЦЬ ГАЗЕТУ

«ЛІТАРАТУРА І МАСТАЦТВА»

КОЖНАМУ ПАЛАЦУ КУЛЬТУРЫ, КІНАТЭАТРУ, КЛУБУ, БІБЛІЯТЭЦЫ, ШКОЛЕ, КОЖНАМУ РАБОТНІКУ КУЛЬТУРЫ І КНІЖНАГА ГАНДЛЮ — ГАЗЕТУ «ЛІТАРАТУРА І МАСТАЦТВА».

Падпіска прымаецца ўсімі ўстановамі сувязі і «Саюздруку», а таксама грамадскімі распаўсюджвальнікамі на заводах, фабрыках, прадпрыемствах, ва ўстановах культуры.

Галоўны рэдактар Н. Е. ПАШКЕВІЧ.

Рэдакцыйная калегія: З. І. АЗГУР, Г. М. БУРАЎКІН, А. І. БУТАКОЎ, К. Л. ГУБАРЭВІЧ, Т. А. ДУБКОВА, Г. М. ЗАГАРОДНІ, В. Ул. ІВАШЫН, А. М. КАШКУРЭВІЧ, В. Б. ЛАДЫГІНА, П. М. МАКАЛЬ, А. Н. МАРЦІНОВІЧ, Р. К. САБАЛЕНКА (намеснік галоўнага рэдактара), І. А. САНКОВА, З. Ф. СТОМА, М. Г. ТКАЧОЎ, Р. Р. ШЫРМА.

Беларускі дзяржаўны тэатральна-мастацкі інстытут аб'яўляе набор у аспірантуру па спецыяльнасці скульптура — адно месца.

Тэрмін падачы заяў да 15 снежня г. г.

Рэктарат.

«Літаратура і мастацтва» выходзіць у аўторак і пятніцу.

НАШ АДРАС І ТЭЛЕФОНЫ: г. Мінск, вул. Захарава, 19. Тэлефоны: прыёмнай рэдакцыі—3-24-61, намесніка галоўнага рэдактара — 3-25-25, адказнага сакратара — 3-44-04, аддзела літаратуры — 3-21-53. аддзела мастацтва — 3-24-62, аддзела культуры — 3-22-04, аддзела інфармацыі — 3-44-04. выдавецтва — 3-19.52, бухгалтэрыі — 3-11-03.

«Литература и искусство» — орган Министерства культуры и правления Союза писателей БССР. Минск.

Друкарня выдавецтва «Звязда».

Індэкс 63856 АТ 03163